КЛЮЧЫ АД КВАТЭРЫ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ АД СЭРЦА 13







ЛЕТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

13 ВЕРАСНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 179 (30313)


## КОРАТКА

● **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб павышэнні пенсій. Дакумент прадугледжвае пераразлік працоўных пенсій і іх павышэнне з 1 кастрычніка 2024 года ў сярэднім на 5 працэнтаў.**

● Тыдзень мабільнасці пройдзе ў Беларусі 16—22 верасня і завяршыцца Днём без аўтамабіля.

● **Міністэрства працы запусціла інтэрнэт-галасаванне за званне пераможцы ў конкурсе «Сям'я года».**

● Беларусь накіравала гуманітарную дапамогу ў Зімбабвэ.

● **МУС прапануе абмеркаваць праект змен у Правілы дарожнага руху.**

● У Беларусі падрыхтавалі праект стратэгіі ўкаранення тэхналогіі 5G.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім РЫЖАНКОЎ, міністр замежных спраў:**

*«У еўразійскім кантэксце і ў рамках «Адзін пояс, адзін шлях» Беларусь з упэўненасцю глядзіць у будучыню і ставіць перад сабой яшчэ больш амбіцыйныя мэты. Напрыклад, аб'яднаць прамысловае развіццё нашай краіны з кітайскім. Пакуль Захад пад надуманымі падставамі спрабуе выцесніць кітайскія тэхналогіі, мы пакажам прыклад іх маштабнага прымянення ў Еўропе. Тое ж самае датычыцца і іншых сфер — ад адукацыі да традыцыйнай кітайскай медыцыны. Мы пераарыентуем наш гандаль на Азію і рады, што Кітай стаў другім гандлёвым партнёрам Беларусі ў свеце. Сёлета наш тавараабарот з далёкім, здавалася б, Кітаем можа перавысіць тавараабарот з суседнім Еўрапейскім саюзам».*


ISSN 1990 — 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Падтрыманне міжнацыянальнага міру — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі»

## Чаму важна чуць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў

**Мерапрыемства, якое прадэманстравала шырыню і гасціннасць беларускай душы, прайшло ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцяў, якія жывуць у Беларусі. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, гэтая сустрэча патрэбна для таго, каб людзі з першых вуснаў пачулі пра беларускую нацыянальную і рэлігійную палітыку на найбліжэйшы час, а можа, і назаўсёды.**



Фота БелТА.

«Мне даводзіцца часта сустракацца з рознымі людзьмі. Але з савецкіх часоў я не прывык дзяліць іх па нацыянальнасцях. Для мяне ўсё роўна, дзе хто нарадзіўся. Я шаную ў людзях першым чынам прыстойнасць, дабрыню, працавітасць, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. — Ды і беларусы пазбаўлены пачуцця нацыянальнай перавагі, бо ведаюць не па чутках, што значыць змагацца за сваю культуру і веру». Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў нашым грамадстве няма размоў аб тытульнай нацыі, нам чужы досвед дзялення па нацыянальнай прыкмеце на грамадзян і неграмадзян, як у некаторых нашых суседзяў.

«Ідэяй народнага адзінства прасякнута ўся наша гісторыя. Тут спрадвеку знаходзілі прытулак людзі, якія ўцякалі ад рэлігійных войн, міжусобіц і ганенняў. А ў дні ліхалецця яны аб'ядноўваліся з мясцовым насельніцтвам, давалі адпор ворагу, перамагалі і разам будавалі сваё беларускае шчасце. Такі ключ да разумення шыфру жыцця на гэтай зямлі, нашай з вамі», — нагадаў Прэзідэнт. Таму, па яго словах, невыпадкова, што сустрэча праходзіць напярэдадні самага маладога, але вельмі знакавага дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства. «Падтрыманне міжнацыянальнага міру — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. І, што там утойваць, мы гэтым ганарымся», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства тыя ж правы і свабоды, што і грамадзянам нашай краіны. Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, а абраза нацыянальнай годнасці праследуецца па законе. На беларускай зямлі ў міры і згодзе ў духу добрасуседства працуюць, ствараюць сем'і і гадуюць дзяцей прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў. «Тут усе яны становяцца нашымі і нават маімі, рускімі, украінцамі, палякамі. Так было, так ёсць і так будзе заўсёды», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

### «Вы сталі нашымі, вы сталі беларусамі»

Прэзідэнт адзначыў, што больш за шэсцьсот гадоў таму да нас прыйшлі яўрэі. Ганімыя ў розных кутках свету, тут яны здабылі магчымасць свабодна і спакойна жыць. І аж да Вялікай Айчыннай вайны па колькасці саступалі толькі карэннаму насельніцтву. «Што казаць, беларуская зямля стала калыскай для трох прэзідэнтаў Дзяржавы Ізраіль. Залман Шазар, Хаім Вейцман, Шымон Перэс — памятаеце гэтыя прозвішчы», — зрабіў важны штрых беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што адначасова з яўрэямі на нашу зямлю прыйшлі татары: «Унікальны народ: адважны, справядлівы, ваяўнічы, да нас ён прыйшоў з мірам — па запрашэнні мясцовых князёў, каб дапамагчы абараніць нашы землі. Перакаваўшы мячы на аралы, татары зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі. І сёння горад Іўе, адзін з цэнтраў іх кампактнага пражывання, па праве славіцца сваімі поспехамі ў эканамічнай і духоўнай сферах». Сёння ў Беларусі налічваецца больш за восем тысяч татар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што паспяхова ўладкоўваюць тут жыццё прадстаўнікі азербайджанскага народа. Алімпійскімі і сусветнымі дасягненнямі нашу краіну праславілі Камандар Маджыдаў, Націк Багіраў і многія іншыя.


СТАР. 2


Медыяпрастора

# Гаворыць і паказвае VIDEOBEL.BY

## Новы мультымедыйны партал прапаноўвае грамадска-палітычны відэакантэнт і ўсе тэлеканалы анлайн

**У Беларусі запусцілі мультымедыйны партал VIDEOBEL.BY. Грамадска-палітычны кантэнт вядучых беларускіх СМІ, у тым ліку ўсіх рэспубліканскіх тэлеканалаў, сабраны ў адным месцы. На партале ёсць месца для анлайн-вяшчання і важных прамых трансляцый, у прыватнасці з мерапрыемстваў, у якіх удзельнічае кіраўнік дзяржавы, а таксама маецца архіў, дзе можна знайсці перадачы сацыяльна-палітычнага зместу асноўных беларускіх СМІ.**

— Мы пастаянна адчуваем ціск, калі нашы рэсурсы імкнуцца закрываць, як толькі мы кажам нязручную праўду, — адзначыў **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ.** — Гэта практыка, якую адчулі нашы саюзнікі, расіяне, і тое самае адбываецца ў адносінах беларускіх каналаў, платформ і любых рэсурсаў, з якімі працуем. Таму мы ствараем беларускую пляцоўку, на якой будзе акумулявацца ўвесь палітычны відэакантэнт, які вырабляем.

Новая платформа дазволіць глядзець яго як у рэжыме рэальнага часу, так і ў архіве. Патрэбную інфармацыю можна знайсці па пэўных тэгах або ў раздзеле тэлеканалаў. VIDEOBEL.BY дасць магчымасць атрымліваць дакладную інфармацыю пра тое, што адбываецца як у Беларусі, так і за межамі нашай краіны.


СТАР. 3


У сезон

# Чым сёлета здзівяць сельгаскірмашы?

**Восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы штогод праводзяцца па ўсёй тэрыторыі нашай краіны, яны ўжо ператварыліся ў абавязковы атрыбут восені. Сёлета стартуюць 14 верасня. У сталіцы сельгаскірмашы выхаднога дня завершаць работу 1 снежня, у Мінскай вобласці — 2 лістапада. Зрэшты, карэктывы могуць унесці ўмовы надвор'я: згодна з санітарнымі нормамі, для рэалізацыі сельгаспрадукцыі на адкрытым паветры тэмпература не павінна апускацца ніжэй за нуль.**




СТАР. 4


Найтаннейшай агароднiна на сельскагаспадарчых кірмашах будзе ў кастрычніку, прагназуюць эксперты сферы гандлю.

# «Падтрыманне міжнацыянальнага міру — адзін з прыярытэтаў

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Важнае месца, па яго словах, займае армянская дыяспара. «Дастаткова сказаць, што адным з першых кіраўнікоў БССР быў армянін Аляксандр Мяснікоў (Мяснікян)», — заўважыў беларускі лідар. Азербайджанцаў у Беларусі жыве каля шасці тысяч, армян — больш за дзевяць тысяч.

Прэзідэнт падкрэсліў, што шматнацыянальны Дагестан у Беларусі прадстаўлены 17 нацыянальнасцямі. Ён звярнуў увагу, што мы далі магчымасць пачаць новае, мірнае жыццё грамадзянам Афганістана і Палесціны, дзе доўгія гады не спыняліся ўзброенае супрацьстаянне і кровапраліцце.

«Прыкладаў, калі людзі з усіх куткоў свету знаходзяць у Сінявокай сваю другую Радзіму, не пералічыць. Часам складваецца ўражанне, што народы, якія прыязджаюць да нас, пакідаюць узаемныя сваркі, папрокі і крыўды на прыгранічных пунктах, як гавораць у Беларусі, «ля парога хаты». Як яшчэ растлумачыць, што тут знаходзяць агульную мову, жывуць у міры і згодзе арабы і яўрэі, азербайджанцы і армяне, грузіны і абхазцы? Растлумачыць я ведаю як. Таму што вы сталі нашымі, вы сталі беларусамі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы разам святкуем Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці. Захоўваем памяць аб прадстаўніках усіх нацыянальнасцяў, якія дапамагалі нам вызваляць, а затым аднаўляць разбураныя фашыстамі гарады і вёскі. Гэта памяць ушанавана ў назвах праспектаў і вуліц населеных пунктаў, імёны герояў прысвоены паркам, скверам і ўстановам адукацыі нашай краіны».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што беларусы адкрыты для ўсіх, хто прыходзіць да нас з чыстымі намерамі, мірам. «Таму беларусам складана зразумець, што рухае еўрапейскімі элітамі ў іх імкненні адгарадзіцца і зноў выбудаваць жалезную заслону, у чым яны нас пастаянна папракалі ў савецкія часы, — заўважыў ён. — Разумеюць, што гэта шлях у нікуды, у адказ мы робім для кагосьці нечаканыя, але натуральныя і зразумелыя для нас крокі: мы, наадварот, адкрываем границы і звяртаемся да народаў Еўропы напрамую. На шчасце, яны нас чуюць. І самае цікавае, што, прыязджаючы да нас, гэтыя людзі становяцца яшчэ большымі патрыётамі Беларусі, чым часам мы самі».

### Дзякуй за патрыятызм!

«Дарагія сябры! У кожнага з вас свая гісторыя, свой лёс, у кагосьці, на жаль, свая бяда. Пройдзеныя вамі выпрабаванні, пераадоленыя цяжкасці, перамога над абставінамі выклікаюць глыбокае пачуццё павагі і шчырай сімпатыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Спадзяюся, на нашай зямлі вы і вашы сем'і здабылі мір і дабрабыт». Прэзідэнт пацікавіўся, як прадстаўнікам розных нацыянальнасцяў жывецца ў Беларусі, якія ёсць нявырашаныя праблемы.

«Вы ведаеце, што Беларусь, кажуць, маленькая, невялікая. Але паверце: тут месца шмат. Мы можам разам з вамі пракарміць яшчэ такую ж колькасць. Мы зацікаўлены, каб вашы блізкія, знаёмыя, родныя па духу людзі прыязджалі да нас у Беларусь. Падкрэсліваю: вы нашы людзі. Што датычыцца мяне як Прэзідэнта (я гэтага не ўтойваю), ніколі не было выпадку, каб вы мяне недзе не падтрымалі ці кінулі ў адзіночку. Вы нават часам задаяце тон нашым беларусам. Вы для нас — самая сапраўдная каштоўнасць. Такіх, як вы, мы заўсёды чакаем у Беларусі, гатовы садзейнічаць у вашым жыцці. Калі здарылася бяда, мы зробім усё, каб вы калі яе не забылі, то кожны ранак не прачыналіся з гэтай бядой. Дзякуй вам за той мір і спакой, які вы дорыце ў Беларусі. Дзякуй за той патрыятызм, які праяўляеце. Я абсалютна перакананы, што вы гэтаксама, як і карэнныя жыхары, шануеце і любіце гэту зямлю, вашу зямлю», — падсумаваў Прэзідэнт.

### «Нашай віны ў абвастрэнні адносін з кіраўніцтам Арменіі абсалютна няма»

Аляксандр Лукашэнка часта паўтарае, што пры напружаных адносінах палітыкаў розных краін адносіны паміж народамі застаюцца цёплымі і сардэчнымі. І гэтая сустрэча ў Палацы Незалежнасці — таму пацверджанне. Старшыня Кансультатыўнага міжэтнічнага Савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Георгій Егіязаран расказаў, што ў Беларусі жыве 45 гадоў, з іх 43 адпрацаваў у сістэме грамадзянскай авіяцыі. «Магу па сабе меркаваць і казаць, што тут да нас людзі ставяцца не па нацыянальнай прыналежнасці, не па рэлігійных перакананнях, а па нашых дзеланых, прафесійных і, галоўнае, чалавечых якасцях», — сказаў ён. Георгій Егіязаран згадаў, што ў аперацыі «Баграціён» удзельнічаў І Прыбалтыйскі фронт, якім камандаваў армянін Іван Баграмян. Ён выступіў з прапановай адну з вуліц Мінска назваць у гонар Маршала Савецкага Саюза, палкаводца Івана Баграмяна. «Нам трэба разгледзець гэта пытанне ў найбліжэйшы час. Гэта вялікі чалавек для нас, беларусаў, — дакладна», — адказаў на гэта Прэзідэнт.

Таксама Георгій Егіязаран запрасіў беларускага лідара на юбілейны, 15-ы фестываль нацыянальных культур, які пройдзе ў Гродне ў 2026 годзе. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што паглыблены ў гісторыю правядзення гэтага фестывалю. Па яго словах, удзельнікі свята на берагах Нёмана робяць Гродна сапраўдным сусветным горадам. І, як прызнаўся Прэзідэнт, ён даўно хацеў яго наведаць, але праз занятасць не мог. «Я падумаў, што мне трэба абавязкова пабываць на гэтым фестывалі. Вы дакладна адгадалі мае думкі», — сказаў ён.

Разам з абмеркаваннем планаў без увагі не засталіся і сённяшнія пытанні. Адно з вострых — адносіны Беларусі і Арменіі. З беларускага боку ўсё празрыста і зразумела: наша краіна заўсёды выступала ў падтрымку не толькі развіцця непасрэдна беларуска-армянскіх адносін, але і за ўрэгуляванне канфлікту ў каўказскім рэгіёне паміж Арменіяй і Азербайджанам. Аб гэтым неадназначна на шматлікіх пляцоўках казаў Аляксандр Лукашэнка. У той жа час кіраўніцтва Арменіі на фоне ў тым ліку ўнутрыпалітычных падзей дапусціла шэраг неадназначных і контрпрадукцыйных выказванняў у адрас не толькі беларускага боку, але і зрабіла крокі ў бок згортвання супрацоўніцтва ў інтэграцыйных фарматах. Напрыклад, армянскі прэм'ер-міністр Нікол Пашынян заявіў, што больш не прыедзе ў Мінск, а таксама не дазволіць гэтага рабіць іншым афіцыйным прадстаўнікам сваёй краіны. Але адносіны паміж армянскім і беларускім народамі застаюцца па-ранейшаму цёплымі і сардэчнымі. Георгій Егіязарн, які таксама з'яўляецца старшынёй грамадскага аб'яднання «Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства «Аястан», у гэтым перакананы. Ужо пасля сустрэчы з Прэзідэнтам ён расказаў журналістам, што не задаволены дзеяннямі армянскіх палітыкаў у дачыненні да Беларусі: «Я разумею: можна паварнуцца да Захаду, Еўрасаюза (гэта пра Арменію), але псаваць адносіны са сваімі сябрамі таксама нельга. Беларусь і Расія — не чужыя краіны. І палітыкі павінны знайсці агульную мову — мы ж паміж людзьмі заўсёды знойдзем». Гаворачы аб абстаноўцы ўнутры Арменіі, Георгій Егіязаран адзначыў, што не ўсе людзі паддаюцца агітацыі аб тым, што ў Еўрапейскім саюзе Арменію чакае светлая будучыня і будзе свяціць яркае сонца. «Я лічу, што сонца няхай свеціць, але выключаць святло ў іншым месцы таксама нельга. Навошта псаваць адносіны з сябрамі? Я думаю, усё ж трэба аднавіць сяброўскія адносіны, усё, што ў нас было і ёсць. Маё асабістае меркаванне — Арменіі было спакайней, калі побач былі пастаянныя сябры Беларусь і Расія і іншыя краіны».

На тое, што было б нядрэнна, калі б у Беларусі і Арменіі (пры ўсіх недахопах і нюансах) будаваліся добрыя адносіны, звяртаў увагу і Прэзідэнт. Па яго словах, віны беларусаў у цяперашнім абвастрэнні адносін з армянамі абсалютна няма. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсім, хто сочыць за палітыкай, зразумела, чаму цяперашняе армянскае кіраўніцтва праводзіла і праводзіць такую палітыку. Прэзідэнт нагадаў, што ў Арменіі вырашылі правесці рэферэндум па ўступленні ў Еўрапейскі саюз. Ён расказаў, што папярэджваў Нікола Пашыняна аб тым, што рабіць гэтага не трэба. «Але вы ведаеце, з якімі ідэямі ён прыйшоў да ўлады. І першыя наскокі былі на Беларусь. Зразумела, што цэліцца ён у нас, а спрабаваў трапіць у Расію. Мы з Пуціным гэта цудоўна бачылі і разумелі. Я Пуціну аб гэтым казаў, і ён мне казаў, што нам не трэба абвастраць адносіны, каб армянскі народ не падумаў, што мы супраць армян. Як бачыце, мы ніяк не рэагавалі. Але сёння ўжо зразумела: еўрапейцы, перш чым ён туды ўступіць, ад кіраўніцтва Арменіі і ад яго патрабуюць нешта зрабіць. За еўрапейцамі стаяць амерыканцы. Без Амерыкі сёння нічога не робіцца там, на Захадзе. Таму ўзялі ў абарот Арменію», — расказаў Прэзідэнт. Ён параіў зазірнуць у нядаўняе мінулае — менавіта па такім сцэнарыі ўсё развівалася ва Украіне.

«Мы ўсяляк імкнуліся дапамагаць армянам, мы супрацоўнічалі як з самымі блізкімі людзьмі. І тое, што здарылася ў Карабаху, — віна толькі кіраўніцтва Арменіі. Толькі. Я іх папярэджваў асабіста, калі ўсе кіраўнікі дзяржаў ці маўчалі, ці былі супраць, аддай ім (Азербайджану) гэтыя тэрыторыі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — На гэтых тэрыторыях нават птушкі не садзіліся і не ляталі, то-бок, там нікога не было. У такой спрыяльнай атмасферы прыроднай, урадлівая зямля — людзі не жылі. Больш за мільён бежанцаў, я іх бачыў у Азербайджане». Беларускі лідар падкрэсліў, што неадназначна заклікаў мірна вырашыць гэтае пытанне. Але армянскае кіраўніцтва прызнавала, што гэта не іх землі, і пры гэтым іх не аддавала. «Даваяваліся? І чаго крыўдзіцца на нас, на Расію? Ты ж сам прызнаваў, што Карабах — тэрыторыя Азербайджана», — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка. Тым больш, па яго словах, кіраўніцтва Азербайджана зацікаўлена ў тым, каб на гэтых землях людзі жылі мірна.

«А тут бах — заява Пашыняна, што «мы згодныя на тэрытарыяльную цэласнасць Азербайджана і Карабах — ваш». На каго крыўдзіцца? Хто цябе за язык цягнуў? Ну я кажу, падобна на нашага «сябра» на поўдні. Ты ж будзь вытрыманым чалавекам, ты кіруеш старажытнай цывілізацыяй, старажытнай краінай. Але вось, бачыце, захацелася на Захад, у ЕС», — расказаў Прэзідэнт.

«Мы не супраць супрацоўніцтва з Захадам, з амерыканцамі, але ж вы бачыце іх палітыку. Заўтра новае кіраўніцтва прыйдзе ў Амерыцы да ўлады, нават старое новае (Камала Харыс і гэтак далей). Вы паглядзіце, зусім іншая будзе палітыка. У іх звычка такая. «А вы хто? Мы вас не ведаем». «Як не ведаеце, вы ж з намі сябравалі, зброю пастаўлялі». «Не, ну гэта былі не мы». Вось іх палітыка», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар расказаў, што неадназова казаў пра гэта кіраўніцтву Арменіі і як дасведчаны палітык папярэджваў, што заходнім партнёрам верыць не варта. Па яго словах, нават наладжваючы новыя сувязі, не трэба губляць старыя, трывалыя і надзейныя: «Ну, вось у вас у руках сініца, ну, не ганяйцеся пакуль за жураўлём. Няхай гэтая сініца ў вас будзе ў руках, не губляйце гэтае сяброўства, гэтае братэрства. Гэта адзіны рынак у эканоміцы, гэта ўзаемная дапамога. Не губляйце гэта. Бо вы, гэта страціўшы, можаце там не набыць нічога». Па словах Прэзідэнта, усе краіны занятыя сваімі справамі, а некаторыя і ўвогуле хочуць вырашыць свае пытанні за кошт іншых.

«Я не апраўдваюся перад вамі. Я хачу, каб вы разумелі, што нашай віны ў абвастрэнні адносін з кіраўніцтвам Арменіі абсалютна няма, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Армяне — вельмі разумныя людзі. Яны не пацерпяць ненармальнай палітыкі, якая не адпавядае менталітэту армянскага народа. У найбліжэйшы час яны разбяруцца, дзе іх шчасце». Прэзідэнт запэўніў, што палітычныя складанасці ніяк не паўплываюць на стаўленне беларусаў да армян, якія жывуць у Беларусі. «Вы для мяне ўжо не армяне, вы для мяне беларусы. Вы нашы людзі, вы нашы грамадзяне, — сказаў ён. — Многія ж не ад шчасця прыехалі. Мы павінны прыняць вас і абагрэць і зрабіць усё для таго, каб вы маглі працаваць і зарабляць, карміць сваю сям'ю». Беларускі лідар запэўніў, што для дасведчаных людзей, якія ўмеюць шанаваць свае сем'і, працы і зямлі ў Беларусі заўсёды хопіць.

### «Наша палітыка не агрэсіўная ў адносінах да Польшчы»

Ад імя палякаў выступіў Аляксандр Сонгін, старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі», дэпутат Палаты прадстаўнікоў. Па яго словах, такі няпросты час, у які мы жывём, выразна відаць, хто якім паветрам дыхае. «Я, вядома, не магу гаварыць за ўсіх, але пераважная большасць беларускіх палякаў дыхае паветрам роднай Беларусі. Мы беларускія палякі, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, жывём, працуем па законах нашай краіны. Дзяржава вельмі шмат робіць для таго, каб людзі розных нацыянальнасцяў жылі тут спакойна і камфортна. І вы не раз гэта падкрэслівалі. І мы на шматлікіх прыкладах гэта бачым. Камунікуючы з жыхарамі па абодва бакі мяжы, вельмі дакладна разумею, што простыя людзі чакаюць найхутчэйшай нармалізацыі адносін паміж краінамі», — сказаў Аляксандр Сонгін. Ён пацікавіўся ў Прэзідэнта, ці ідуць на кантакт польскія ўлады па прапановах беларускага боку ў частцы ўрэгулявання існуючых адносін.

«Не буду гаварыць пра нашы адносіны з кіраўніцтвам Польшчы. Я не хачу сказаць, што з усімі палякамі ў Польшчы ў нас бліскучыя адносіны, але 99 % палякаў разумеюць нашу палітыку і, упэўнены, падтрымліваюць яе. Наша палітыка не агрэсіўная ў адносінах да Польшчы. Мы не стараемся навязаць сваю палітыку, не стараемся ваяваць з Польшчай. Мы выдатна разумеем, што ў гэтай вайне загінуць мільёны і ніхто не выйграе. І яна нам не патрэбна. Нам патрэбны мір і спакой. Беларусам больш нічога не трэба», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка. Але, па яго словах, праблема ў тым, што Польшчу спрабуюць зрабіць марыянеткай ЗША. Не проста так польскія ўлады трацяць пяць працэнтаў валавога ўнутранага прадукту, мільярды долараў, на закупку зброі. «Хто збіраецца нападаць на Польшчу? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — Ну, а нам, што нам ад палякаў трэба? Нам нічога не патрэбна. Што патрэбна палякам ад нас? Ну, зразумела. Трэба зноў Заходняя Беларусь, Заходняя Украіна. Хтосьці яшчэ гэтымі амбіцыямі пакутуе. Паслухайце, гэта абсалютна немагчыма».

«Скарыць Беларусь нікому не ўдасца. У нас дастаткова сяброў, ды і мы не лыкам шытыя», — канстатаваў Прэзідэнт. Ён прывёў яшчэ адзін важкі аргумент: ваяваць на лясіста-балоцістай беларускай мясцовасці немагчыма, гэта можа прывесці да шматлікіх ахвяр.

Аляксандр Лукашэнка згадаў, на якія пытанні палякі цяпер звяртаюць найбольшую ўвагу, і растлумачыў, чаму гэта бессэнсоўна. Першае пытанне — міграцыйны крызіс. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Беларусь плённа супрацоўнічала з еўрапейскімі краінамі па гэтым пытанні. Заходнія краіны выдаткоўвалі сродкі на будаўніцтва на Беларусі цэнтраў для мігрантаў, дзе іх прымалі беларусы. Усіх задавальняла такое супрацоўніцтва. Роўна да таго моманту, калі Еўрапейскі саюз увёў санкцыі супраць Беларусі. «Я адкрыта сказаў: «Усё, ніякага супрацоўніцтва. Мы вас абараняць не будзем». Мы іх баранілі ад гэтага наплыву. Чаму мы павінны абараняць іх з пятлёй на шыі? Вы чулі гэтыя мае выказванні. У чым я не маю рацыі? Цяпер яны нам прад'яўляюць нейкія неабгрунтаваныя прэтэнзіі, я на іх нават увагі не звяртаю», — абурыўся беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў размовы накшталт: «вось кітайцы прымусілі Лукашэнку, каб ён змякчыў міграцыйную палітыку ў дачыненні да Польшчы». «З кітайцамі мы не абмяркоўвалі нават гэтых тэм. Ніколі Сі Цзіньпін, ведаючы мяне, не скажа, «ты там у адносінах Польшчы нешта зрабі...» — сказаў ён.

Змяншэнне патоку бежанцаў, якія спрабуюць трапіць у ЕС праз беларускую граніцу, Аляксандр Лукашэнка растлумачыў дзеяннямі самога беларускага боку. Прэзідэнт расказаў, што даў даручэнне папярэджваць бежанцаў, каб яны не ехалі сюды ў спробах трапіць у Еўрасаюз, паколькі гэта можа быць небяспечна. Пабудаваную агароджу на беларуска-польскай граніцы Прэзідэнт чарговы раз назваў глупствам, асабліва ў сучасным свеце: «Каб пераадолець агароджу (мы інфармацыю гэтую маем), мігранту трэба 4 хвіліны. Навошта пабудавалі? Мільёны долараў уклалі, раскралі палову. Вось трэба што палякам давесці».

Другое пытанне, якое, па словах Аляксандра Лукашэнкі,

# дзяржаўнай палітыкі»

не справа польскіх улад як мінімум, — вызваленне палітзняволеных. «Якіх палітзняволеных? Вы ж бачылі, што рабілася ў спакойнай ціхай Беларусі ў 2020 годзе. Мы каму нешта дрэннае зрабілі? Але мы справіліся. І мы пасля гэтага пачалі з вамі, з беларусамі больш актыўна працаваць, каб гэтага больш не дапусціць, каб тут быў мір і спакой. Толькі гэта, больш нічога нас не цікавіць. Якія палітзняволеныя? У нас такіх артыкулаў няма. І потым, ваша якая справа? Там у Польшчы разбярыцеся, у вас там, божа мой, колькі праблем», — заўважыў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ад суседзяў часта чуваць папрокі ў парушэнні правоў чалавека. Але ён заўважыў, што менавіта польскі бок забівае мігрантаў на границы і перакідвае іх на беларускі бок. «Якія правы чалавека, якія прэтэнзіі вы нам прад'яўляеце, калі вы пазбаўляеце людзей галоўнага права — жыць?» — сказаў ён. Пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка і сітуацыю вакол асуджанага ў Беларусі Андрэя Пачобута: «Добра, забірайце. А ён гаворыць: «Я туды не паеду, мне не трэба». А яны і не хочуць яго забіраць. Проста гэта стала палітычнай разменнай манетай».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Польшча выкарыстоўвае любую нагоду, каб абвастрыць адносіны з Беларуссю. «І палякам гэта не трэба, і кіраўніцтву цяперашняму Польшчы гэта не трэба (яны гэта разумеюць), але «дзядзька Сэм» прымушае. Амерыканцам трэба, каб тут, у Еўропе была вайна, тады яны будуць у фаворы», — заўважыў ён. Беларускі лідар растлумачыў, што для ЗША высокатэхналагічная Еўропа — канкурэнт. Таму яны штурхаюць яе да вайны, а Польшча стала ў гэтым марыянеткай.

«У нас нармальныя адносіны, нармальная палітыка. Мы ім прапануем нармальнае жыццё, давайце супрацоўнічаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён прывёў у прыклад польскіх бізнесменаў, якія спакойна зараблялі грошы ў Беларусі ці Расіі, прывозілі іх у сваю краіну, а сёння «прыйшлі ў шаленства» ад таго, што ім гэта забаранілі польскія ўлады. «Яны сабе ўжо не толькі ў нагу стрэлілі, нават у галаву. Вось іх палітыка», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён прызнаў, што не можа такога быць: адзін бок вінаваты, а другі — не. Тамму, па словах кіраўніка дзяржавы, беларускі бок гатовы зрабіць крок насустрач. «Час нас рассудзіць. Мне перад нашымі палякамі, перад вамі абсалютна не сорамна. Мы гатовы хоць заўтра нармалізаваць з імі адносіны», — сказаў беларускі лідар. Аднак пакуль такіх настрояў не назіраецца з польскага боку. Беларускі ж бок выступае за мір і спакой, як у Беларусі, так і ў Польшчы: «Калі, крый божа, нешта здарыцца ў Польшчы, як ва Украіне, нам лёгка не будзе. Але яны павінны разумець, што нас на калені пастaвіць немагчыма. Гэта пустая справа, патрацяць грошы, і, не дай бог, загубяць людзей». Прэзідэнт прызнаўся, што сёння ў Беларусі больш увагі звяртаюць на границу з Польшчай, чым з Украінай. Хаця там ідзе вайна, а ў Польшчы быццам бы не. «Мы вымушаны бараніцца. Тым больш у нас ёсць усё, каб абараняць сваю краіну. І вагацца для абароны сваёй Беларусі не будзем (вы мяне ведаеце, характар мой). Ліній ніякіх маляваць не будзем. Не дай бог, толькі ступяць на гэту зямлю. Паважаюць толькі моцных. Таму слабасці не павінна быць», — папярэдзіў ён. Разам з тым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што беларусы і палякі заўсёды знаходзілі агульную мову і жылі ў міры. «Час патрэбны. Час і цярпенне. Ні ў якім разе нельга наступаць і размахваць зброяй. Ні ў якім разе, — сказаў ён. — Мы праводзім разумную, стрыманую палітыку. Мяч на іх баку. Мы гатовы настолькі глыбока з імі супрацоўнічаць, наколькі яны да гэтага гатовы».

## «За кошт Украіны і Беларусі ЗША хочуць вырашаць праблемы з Расіяй і Кітаем»

«Вялікі гістарычны шлях звязвае беларусаў і ўкраінцаў, пройдзены беларусамі і ўкраінцамі. І гэта дае ўсе падставы сцвярджаць, што такое адзінства не можа быць разбурана. Як жа можна апраўдаць падступныя намеры нацягнуць калючы дрот паміж сэрцамі беларусаў і ўкраінцаў, якіх звязвае шматвяковая гісторыя, моўная роднасць, штодзённая жыццёвая практыка і асабліва памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Мы сёння заклікаем усе сусветныя ўрады спыніць канфлікт, не дапусціць вырошчвання ідэй чалавеканенавісніцтва, спыніць ганенні на людзей па моўнай прыкмеце, па рэлігійнай прыналежнасці, па нацыянальнай прыкмеце», — з такімі словамі выступіў старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра» Уладзіслаў Кадзіра. Ён падкрэсліў, што ўсе, хто сабраўся ў гэтай зале, усе, хто прадстаўляе шматаблічную Беларусь, павінны стаць прыкладам для іншых дзяржаў. «Мы разам плячо ў пляча працуем, ствараем. Мы розныя, але мы адзіныя. Мы адзіная сям'я нашай Беларусі», — заключыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён ніколі не хаваў, што яго карані, яго прадзед з украінскага Чарнігава. Ён нагадаў, што беларускі бок заўжды імкнуўся выбудоўваць добрыя адносіны з паўднёвымі суседзямі. «Тое, што адбываецца ва Украіне, — сумна. Прычыну вы ведаеце. Трэба было паспрабаваць вырашыць гэтае пытанне спакойна», — сказаў беларускі лідар. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што адным з ініцыятараў распаду СССР быў прэзідэнт Украіны Леанід Краўчук. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, калі пачаліся працэсы, якія прывялі да развалу СССР, і Беларусь, і Украіна паціралі рукі, чакаючы незалежнасці. Пры гэтым Расія ўзяла на сябе адказнасць і дапамагала краінам, якія атрымалі гэту незалежнасць, устаць на ногі і ўмацавацца. Аднак у 2010-х гадах, калі ва Украіне пачалі прыгнятаць рускіх, Расійская Федэрацыя не змагла застацца ўбаку і вырашыла заступіцца за іх. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што пытаўся ў прадстаўнікоў Злучаных Штатаў, як бы зрабілі яны на месцы Расіі, калі б іх грамадзян пачалі прыгнятаць у суседняй Мексіцы. Адказ, паводле яго слоў, быў адназначным: ЗША сцерлі б суседа з твару Зямлі. «Дык а чаго вы Расію асуджаеце?» — спытаў Прэзідэнт.

«У Мінску сабраліся, вось за гэтым сталом. Аказваецца, сабраліся, каб падмануць Расію. Ну, яны цяпер так гавораць на Захадзе», — беларускі лідар згадаў і перагаворы нармандскай чацвёркі ў Мінску 2015 года. Але, паводле яго слоў, насамрэч ніхто тады не збіраўся нікога падманваць. Усе разлічвалі, што пытанне будзе вырашана. А размовы аб падмане — даніна модзе і часу. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што тады бакі спакойна аб усім дамовіліся, але ўкраінцы не сталі вырашаць пытанні па дамоўленасцях і гэтым ганарыліся. «Зяленскаму дасталася гэтая ўлада з вялізнымі праблемамі. Дык ты іх вырашай, ты ж абяцаў іх вырашаць. А ён да вайны давёў», — сказаў беларускі лідар. Ён расказаў, як у першыя дні сутыкнення раіў Уладзіміру Зяленскаму супакоіцца. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок ініцыіраваў мірныя перагаворы. Першая сустрэча прайшла ў Гомелі, потым — у Белавежскай пушчы. Беларускі лідар нагадаў, што на перагаворах у Стамбуле бакі ўжо выйшлі на пытанні, якія трэба вырашаць дзвюм краінам. «Адзін аднаго былі гатовы страляць у Гомелі. А да чацвёртай сустрэчы ўжо выйшлі на тое, на што Пуцін спасылаецца. Гэта яшчэ не дамова, але ўжо вылучылі пытанні, якія трэба вырашаць. Пуцін цяпер кажа: «Ну, мы ж у Стамбуле дамовіліся, калі весці далей перагаворы, то давайце возьмем гэты дакумент». Гэта правільна. Не падпішам, а адсюль пачнём, з улікам рэалій змяніліся ж шмат», — аднавіў падзеі Аляксандр Лукашэнка. Ён адказаў на папрокі ў тым, што Беларусь дапамагае Расіі: «Ды дапамагаем, гэта наш саюзнік. Украіне дапамагаюць 50 дзяржаў свету, Расіі дапамагае адна Беларусь, таму што мы юрыдычна і фактычна павінны гэта рабіць». Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што Украіна раней, чым Захад, увяла санкцыі супраць Беларусі, па надуманых прычынах закрыла неба для беларускай грамадзянскай авіяцыі, арыштавала некалькі тысяч беларускіх вагонаў з мінеральнымі ўгнаеннямі і да гэтага часу не вярнула, арыштавала 75 беларускіх фур, трох чалавек забілі. «Вы навошта гэта робіце, мы ж вам не чужыя людзі?! Чаму? Трэба было па камандзе амерыканцаў распаліць буйны пажар. У 2020 годзе яны нас не нахілілі, войскі НАТА сюды не ўвялі. А як далей? Яны бачаць, што мы не саступім. Калі каляровая рэвалюцыя ці што, мы абаронім краіну. А трэба падысці пад Смаленск. Усё ж супраць Расіі было нацэлена. Мы гэта разумелі. Таму мы паводзілі сябе акуратна, асцярожна. Але ўкраінцы пабеглі наперадзе паравоза па камандзе амерыканцаў, яны пачалі абвастраць з намі адносіны, яны разлічвалі, што я таксама пачну ўцягвацца ў вайну. Ім шчасце было б цяпер, калі б Беларусь уступіла ў гэту вайну. Але на сёння, наколькі магчыма, я раблю ўсё, каб завяршыць гэта», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што папярэджваў Уладзіміра Зяленскага аб тым, што новая ўлада ў ЗША або ў Еўрапейскім саюзе вельмі хутка забудзе аб украінскіх пытаннях. Таксама, па словах беларускага лідара, кіраўніцтва Расіі першапачаткова было настроена на мірнае вырашэнне канфлікту і нават абяцала дапамогу. «Не. Амерыканцы штурхалі, штурхалі. Ім трэба за наш кошт вырашыць праблему з Расіяй, а потым з Кітаем разабрацца. Яны за кошт гэтага жывуць. Калі яны не вырашаць пытанні з намі, Расіяй, Кітаем, Іранам цяпер, яны багатымі не будуць, яны ўжо друкаваць сваю валюту так не змогуць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што свет сёння вельмі нестабільны і ніхто не можа сказаць, што будзе заўтра. «Трэба супакоіцца. Нашымі рукамі нас будуць забіваць, яны гэта і робяць. Таму трэба спыніцца. Нам уцягвацца ў гэту бойню не трэба, бо будзе нялёгка, хаця камусьці гэта вельмі-вельмі трэба. Трэба вытрымаць, трэба цярпець», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## У Беларусі работа знойдзецца ўсім

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што армяне, азербайджанцы, дагестанцы, украінцы ў Беларусі жывуць у адным доме. «Сярод вас і дактары, і настаўнікі. І самае галоўнае — патрыёты. Я сваім беларусам часта прыводжу вас у прыклад: «Вось глядзіце, людзі прыехалі, а больш патрыятычныя, чым некаторыя», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што быў рады гэтай сустрэчы і заклікаў запрашаць у Беларусь родных і знаёмых. Асабліва тых, хто хоча працаваць, паводле яго слоў, у Беларусі работа знойдзецца ўсім. «Нам патрэбны гэтыя людзі, мы гатовы іх прыняць», — падкрэсліў ён. Таксама Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Беларусь заўсёды гатова працягнуць руку дапамогі тым, хто трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю і вымушаны пакінуць родную краіну. Такая практыка ўжо адпрацаваная і нязменная. «Ёсць што паесці, дзе працаваць і зарабіць. Чалавек, які хоча зарабіць у Беларусі, — гэта добра, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Тут шмат месцаў, дзе можна зарабіць, аднак трэба варушыцца. Але я ведаю, што ў адрозненне ад многіх нашых беларусаў вы людзі варушкія і вы сабе на хлеб зарабляеце».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# З ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ,

## ішлі людзі на прыём да Наталлі КАЧАНАВАЙ

**Учора ў Гродзенскай вобласці прайшоў адзіны дзень прыёму грамадзян. Мерапрыемства стала ўжо традыцыйным для Савета Рэспублікі. Учора сенатары працавалі ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава праводзіла прыём грамадзян па асабістых пытаннях у Іўі.**

Сярод тых, хто звярнуўся са сваім пытаннем да старшыні Савета Рэспублікі, — жыхарка в. Ганчары Іўеўскага раёна. Жанчына хоча выкупіць жылы дом, у якім жыве з 1999 года. Ён знаходзіцца ва ўласнасці прадпрыемства. Звярнуўшыся да кіраўніцтва па дазвол, прасіцелька атрымала адмову.

«Мы толькі абмяркоўвалі на экспертным савеце гэта пытанне, дэталёва прагаворвалі. Разглядалі такія жыццёвыя сітуацыі. І мы хочам заканадаўча пытанне ўрэгуляваць. Яго разглядалі і ўзнімалі і дэпутаты, і мы, — сказала ў час прыёму Наталля Качанава. — На сваім узроўні мы разбяромся, што можна ў адпаведнасці з законам зрабіць. Усё вывучым разам з Дзяржкаммаёмасцю. Калі трэба, заканадаўча ўрэгулюем, таму што такія пытанні ўзнікаюць у людзей».

Другая жыхарка Іўеўскага раёна прыйшла з просьбай дапамагчы ў пытанні налічэння пенсіі. Жанчына — шматдзетная маці, якая працавала ў мясцовай гаспадарцы, выйшла на пенсію, пасля працавала яшчэ на працягу двух гадоў. Наталля Качанава даручыла Міністэрству працы і сацыяльнай абароны яшчэ раз уважліва пераправерыць усе дакументы па працоўнай дзейнасці жанчыны. У час прыёму таксама было даручана на гэтым этапе зрабіць усё для выплаты матэрыяльнай дапамогі жанчыне.

«Нам трэба больш тлумачыць людзям, больш гаварыць аб гэтым у сродках масавай інфармацыі. Мы цяпер цесна зоймемся вёскай, створым рабочую групу ў Савеце Рэспублікі і будзем выязджаць», — адзначыла Наталля Качанава.

Сваю прапанову аб заканадаўчым рэгуляванні палажэнняў, звязаных з дзейнасцю прыватных пансіянатаў, адрасавала жыхарка Мінска. Жанчына арганізавала ў Мінскім раёне такі пансіянат для пажылых.

Як адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, пытанне арганізацыі дзейнасці такіх устаноў вельмі актуальнае. Паводле слоў Старшыні, важна пільную ўвагу ўдзяліць дзейнасці гэтых арганізацый у маштабах краіны.

«У найбліжэйшы час пад'едзем, паглядзім, як працуюць нашы органы сацабароны. Мінпрацы сумесна з Міністэрствам унутраных спраў павінны правесці інвентарызацыю такіх устаноў, дзе людзі знаходзяцца кругласутачна. Павінны быць выкананы ўсе патрабаванні», — адзначыла Наталля Качанава.

***Было яшчэ шмат зваротаў і пытанняў — прыём Наталля Качанава вяла літаральна цэлы дзень. Падрабязна аб ім — у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».***

# Гаворыць і паказвае VIDEOBEL.BY

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Фактычна мы ствараем канкрэтны інфармацыйны хаб, з дапамогай якога атрымлівацъ інфармацыю змогуць усе, хто зацікаўлены ў дакладных навінах з Беларусі. Такіх людзей вялікая колькасць. Літаральна ўчора ў мяне была сустрэча з адным сербскім парламентарыем, і ён абсалютна дакладна сказаў: інфармацыя, якая ў Еўропе распаўсюджваецца аб тым, што адбываецца ў Беларусі, не мае адносін да рэальнасці. Таму задача — паказаць нашу рэчаіснасць, выкарыстоўваючы інструмент, які не будзе знаходзіцца ў руках нашых апанентаў. Гэта галоўная задума.

Пры гэтым у беларускай інфармацыйнай прасторы давер да дзяржаўных СМІ расце. Паводле слоў Марата Маркава, папулярнасць дзяржаўных тэлеканалаў і ў цэлым дзяржаўных СМІ за апошнія два гады, як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, павялічылася амаль у 1,5 раза. Нягледзячы на тое, што ўсе беларускія тэлеканалы даступныя цяпер на новай платформе, новы рэсурс не стане ім канкурэнтам.

— Гледачы, якія заходзілі на тэлеканалы, па-ранейшаму зойдуць на іх. Наша ж пляцоўка вельмі зручная, бо тут ёсць яшчэ і навіны. Тут жа можна знайсці ўсе праграмы тэлеканалаў, глядзець іх анлайн, — адзначыла **генеральны дырэктар БелТА Ірына АКУЛОВІЧ.**

Яна расказала, што на партале ўжо загружана тысяча відэа з тайм-кодамі, працуюць пошукавыя запыты. Каманда VIDEOBEL.BY будзе працаваць кругласутачна, кантэнт выпускаць плануецца аператыўна.

— Мы за інфармацыйную бяспеку і разумеем, што праўду не любіць ніхто: выразаюць, стараюцца закрываць асобныя праекты, асобныя каналы. Гэта беларускі медыяпартал, разлічаны на людзей, якім цікава, што адбываецца ў нашай краіне, — падкрэсліла Ірына Акуловіч. — Цалкам магчыма, праз некалькі гадоў мы тут будзем бачыць рэгіянальныя СМІ. Будзем рухацца наперад. Гэта першы крок, але яго важна было зрабіць нашай беларускай дзяржаве. І мы яго робім.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Чым сёлета здзівяць сельгаскірмашы?

## Лакацыі і ўдзельнікі

Сёлета сваё 957-годдзе Мінск будзе адзначаць якраз 14 верасня — на гэты дзень запланаваны асноўныя ўрачыстасці. Але, нягледзячы на тое, што многія лакацыі будуць заняты, прынята рашэнне зрабіць гэты дзень таксама стартам штогадовых сельскагаспадарчых кірмашоў, расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ.** Зроблена гэта з мэтай задаволіць попыт жыхароў сталіцы на свежую айчынную сельскагаспадарчую прадукцыю, а таксама даць магчымасць вытворцам гэтай прадукцыі рэалізаваць яе лішкі.

Заўважым, што раней планавалася распачаць работу сезонных кірмашоў з 16 верасня, але пачаць вырашылі раней. А скончыць пазней, чым у мінулыя гады. Калі казаць аб лакацыях правядзення сезонных кірмашоў у сталіцы, то тут змен не чакаецца. Цэнтральнай па-ранейшаму застаецца пляцоўка каля «Чыжоўка-Арэны»: наяўнасць там вялікай колькасці парковачных месцаў зручна і жыхарам горада, і сельгасвытворцам — дазваляе прапанаваць максімальную колькасць сваёй прадукцыі спажыўцу. Вядома, кірмашы будуць праводзіцца і ў кожным раёне сталіцы: час работы лакацый, даты вызначаны, і падрабязная інфармацыя размешчана як на сайце Мінгарвыканкама, так і на сайтах адміністрацый раёнаў горада. А ў выпадку ўзнікнення нейкіх дадатковых пытанняў мінчане могуць звярнуцца непасрэдна ў адміністрацыі раёнаў і атрымаць вычарпальную інфармацыю, адзначыла спецыяліст.

Што датычыцца ўдзельнікаў, то гэта, перш за ўсё, прадпрыемствы-вытворцы з усёй краіны — ім загадзя былі разасланы запрашэнні, і найбольш запатрабаваныя спажыўцом прадпрыемствы ў ліку першых пацвердзілі свой удзел: перш за ўсё мяса-малочнай прамысловасці

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Сёлета акцэнт будзе зроблены ў тым ліку на мясныя вырабы, бо яны заўсёды карыстаюцца пакупніцкім попытам, расказалі арганізатары сезонных кірмашоў.

ўсіх абласцей краіны.

Таксама актыўны ўдзел у сельскагаспадарчых кірмашах возьмуць прадпрыемствы Белкаапсаюза, чыя прадукцыя карыстаецца павышаным попытам у мінчан. Прычым яны разгорнуць гандаль не толькі на цэнтральнай пляцоўцы, побач з «Чыжоўкай-Арэнай», але і раённых. Фермеры і фізічныя асобы маюць адпаведныя дакументы, што прадукцыя вырашчана ў іх на ўчастках. Удзел у кірмашах для фізічных асоб бясплатны.

Зрэшты, садавіну і агародніну новага ўраджаю непасрэдна ад вытворцы мінчане змогуць набыць не толькі ў выхадныя дні.

— Акрамя сельскагаспадарчых сезонных кірмашоў выхаднога дня штогод у Мінску арганізоўваецца работа пляцовак па рэалізацыі сельгаспрадукцыі, — расказала Алена Нагорная. — Такая практыка неабходна, таму што не заўсёды жыхары паспяваюць пабываць на кірмашах у выхадныя дні, часам сярод тыдня ўзнікае патрэба набыць свежую плодаагародніную прадукцыю.

Гэтай восенню ў Мінску арганізавана 99 такіх пляцовак — у кожным раёне сталіцы іх дастаткова. Пры выбары месцаў размяшчэння пляцовак улічваліся пажаданні грамадзян, асабліва насельніцтва пажылога ўзросту, падкрэсліла спецыяліст. Інфармацыя аб гэтых пляцоўках таксама размешчана на сайтах адміністрацый раёнаў.

— Пляцоўкі пачнуць працаваць адразу ж пасля сельгаскірмашоў, з 16 верасня, да 17 лістапада штодня, — рэзюмавала начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.



У гэтым годзе чакаецца шмат удзельнікаў, якія прапануюць наведвальнікам мёд.

## Па Міншчыне будзе арганізавана дастаўка

У Мінскай вобласці сезонныя сельскагаспадарчыя кірмашы таксама пачнуць працу 14 верасня, але завершаць яе раней, чым у сталіцы, — на пачатку лістапада.

— Даты правядзення буйных рэгіянальных кірмашоў ужо вызначаны, — падзялілася **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Наталля СУЙКОВА.** — Так, напрыклад, 5 кастрычніка такі кірмаш пройдзе ў Барысаве, 6-га — у Нясвіжы, 12 кастрычніка — у Бараўлянах, Вілейцы, Маладзечне, Салігорску, 19 кастрычніка — у Слуцку. А ў цэлым, сельскагаспадарчыя сезонныя кірмашы пройдуць у кожным рэгіёне вобласці. Асноўныя лакацыі насельніцтву вядомыя, яны, як правіла, пастаянныя — гэта тэрыторыі гандлёвых пляцовак, рынкаў, цэнтральных плошчаў гарадоў. Месцы вызначаны такім чынам, каб было зручна насельніцтву і ўдзельнікам кірмашоў для пад'езда і размяшчэння, — дадала спецыяліст.

Агульная колькасць сезонных сельскагаспадарчых кірмашоў у перыяд іх правядзення з года ў год складае каля 150, расказала прадстаўнік Мінаблвыканкама. Традыцыйна ў шырокім асартыменце насельніцтву прапануецца сельгаспрадукцыя новага ўраджаю, харчовыя тавары. Штогод актыўны ўдзел бяруць вытворцы мясной, малочнай, рыбнай прадукцыі. І менавіта на яе сёлета будзе зроблены акцэнт, паколькі яна карыстаецца найбольшым попытам.

— У кірмашах выхаднога дня прымуць удзел сельскагаспадарчыя арганізацыі, сялянскія і фермерскія гаспадаркі, арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання розных форм уласнасці, — канкрэтызавала прадстаўнік Мінаблвыканкама. — Чакаецца актыўны ўдзел прадпрыемстваў патрэбкааперацыі, харчовай і перапрацоўчай прамысловасці, бытавога абслугоўвання, а таксама рамеснікаў. Бо кірмашы прываблiваюць спажыўцоў магчымасцю набыць шырокі асартымент якаснай экалагічнай прадукцыі непасрэдна ад вытворцы. А для аказання дапамогі асобным катэгорыям грамадзян плануецца арганізаваць паслугі па дастаўцы набытых тавараў.

Акрамя таго, кірмашы прадугледжваюць шырокую культурна-масавую праграму: выступленні народных калектываў, цікавыя актыўнасці для розных узростаў, арганізацыю вольнага часу для дзяцей.

## А што новага?

Відавочна, што сельскагаспадарчыя кірмашы — гэта ўжо ўстойлівая, традыцыйная форма арганізацыі продажу сезонных тавараў, зручная і спажыўцам, і вытворцам. Акрамя плодаагародніннай прадукцыі ў іх асартыменце ўжо не першы год грыбы і арэхі, лясныя ягады, прадукты пчалярства, мясная і малочная прадукцыя і нават лекавыя травы. І ўсё ж кожны год арганізатары імкнуцца прыўнесці нешта новае, што парадуе пакупніка.

— Пралічыць загадзя колькасць удзельнікаў такіх кірмашоў немагчыма, бо іх склад фарміруецца па заяўным прынцыпе, — адзначыла Алена Нагорная. — У асобных раёнах сталіцы кожную восень больш за пяць гадоў на такіх кірмашах працуюць адны і тыя ж фермеры і фізічныя асобы — прыязджаюць з Брэсцкай, Гродзенскай, іншых абласцей адрасна, да свайго спажыўца, які чакае пэўны сорт бульбы, капусты ці цыбулі. У гэтым годзе чакаецца вялікая колькасць разнастайнай мясной прадукцыі — яна карыстаецца попытам. Будзе шмат удзельнікаў, якія рэалізоўваюць мёд.

Але ж людзі наведваюць сезонныя кірмашы не толькі каб набыць прадукты харчавання, падкрэсліла яна. Наведвальнікі прыходзяць адпачыць, паразмаўляць, пакаштаваць нешта незвычайнае. Прыходзяць па станоўчыя эмоцыі. І, у прыватнасці, на станоўчыя эмоцыі будзе працаваць прадукцыя лясгасаў. Гэтай восенню яны сталі актыўнымі ўдзельнікамі кірмашоў выхаднога дня, і іх прадукцыя, без сумневу, будзе карыстацца попытам. Арганізатары спадзяюцца, што наведвальнікаў сезонных кірмашоў уразяць асартыментам прадпрыемствы Белкаапсаюза: на іх прадукцыю заўсёды вялікі попыт, і, напэўна, гэтай восенню яны парадуюць мінчан не толькі ўжо ўпадабанай пакупнікамі прадукцыяй, але і навінкамі.

Што датычыцца Мінскай вобласці, Наталля Суйкова таксама адзначыла актыўнасць лесагаспадарчых арганізацый: сёлета яны пашыраюць сваю прысутнасць з самымі рознымі таварнымі пазіцыямі. Пашыраецца таксама прысутнасць на гандлёвых сезонных пляцоўках рамеснікаў — у прыватнасці з шырокім асартыментам аўтарскіх вырабаў для кухні і дома з дрэва, які заўсёды выклікае пакупніцкі інтарэс. Акрамя таго, сёлета чакаецца актыўны ўдзел у сезонных кірмашах рыбгасаў. І гэта не толькі жывая рыба. У асартыменце — і рыба вэнджаная, і іншыя рыбныя вырабы, і юшка. Будуць праводзіцца дэгустацыі, а гэтая форма работы заўсёды выклікае цікавасць у наведвальнікаў.

І, нарэшце, найбольш важнае для пакупніка пытанне — наколькі таннай будзе сёлета на сезонных кірмашах сельскагаспадарчая прадукцыя?

— Як бы мы ні прыцягвалі арганізацыі, у большасці сярод прадаўцоў на сезонных кірмашах усё ж фізічныя асобы. А гэта значыць, што цэны рэгулюе рынак, — адзначыла Алена Нагорная. — Заканадаўства не прадугледжвае рэгуляванне цэн у рамках работы фізічных асоб, а арганізацыі прыязджаюць на сезонныя кірмашы ўжо з усталяванымі цэнамі. У верасні яшчэ далёка не ўсе фізічныя асобы гатовы прыняць удзел у кірмашах, канкурэнцыя невялікая, прадаўцы прыглядаюцца адзін да аднаго. Зразумела, што цэны на сезонных кірмашах і ў верасні будуць ніжэйшыя, чым на буйных рынках сталіцы. Але найбольш нізкія яны бываюць звычайна да самага актыўнага часу правядзення кірмашоў — гэта практычна і ўвогуле ўвесь кастрычнік. У прадаўцоў найбольшая канкурэнцыя, прадукцыі больш чым дастаткова, асабліва што датычыцца гародніны адкрытага грунту (бульба, буракі, капуста, цыбуля, морква). І яна становіцца значна таннейшай.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ЗША ўвялі каменданцкую гадзіну з-за смяротнага віруса



Улады штата Вермонт заклікалі мясцовых жыхароў не пакідаць дамы ў начны час у сувязі з рызыкай укусу камароў, якія могуць быць пераносчыкамі віруса ўсходняга энцэфаліту коней, паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на Vermont Public. Улады штата апублікавалі спіс з 16 гарадоў з розным узроўнем рызыкі, а таксама адмянілі або перанеслі некаторыя грамадскія мерапрыемствы, якія праводзяцца ў начны час на адкрытым паветры. Аналагічныя меры былі таксама прыняты ў некалькіх гарадах штата Масачусетс, заяўляе газета The Washington Post. Усходні энцэфаліт коней — рэдкае віруснае захворванне, якое распаўсюджваецца некаторымі відамі камароў. У людзей яно працякае цяжка, суправаджаецца неўралагічнай сімптаматыкай аж да смяротнага зыходу.

## На поўначы Нігерыі з-за паводак пацярпеў мільён чалавек



Губернатар нігерыйскага штата Борна Бабагана Умара Зулум заявіў, што ад паводкі пацярпелі ў агульнай колькасці мільён чалавек, а больш за 200 тысяч былі вымушаны пакінуць затоплены горад Майдугуры. Аб гэтым паведаміла газета Daily Trust. Губернатар адзначыў, што для прадухілення эпідэмій, звязаных з паводкай, быў створаны Камітэт па надзвычайных сітуацыях. Старшыня Асацыяцыі ўрачоў Абубакар Нгубда папярэдзіў, што ў штаце высокая рызыка захворванняў, якія перадаюцца праз ваду, паколькі паводка забрудзіла паверхневыя воды ў пацярпелых раёнах. Генеральны дырэктар музея-парку Санда К'ярымі ў Майдугуры Алі Абатча паведаміў, што ў выніку паводкі загінула 80 працэнтаў дзікіх жывёл у заапарку, а смяротна небяспечныя, такія як кракадзілы і змеі, апынуліся на волі. Па звестках Нацыянальнага агенцтва па кіраванні надзвычайнымі сітуацыямі, вялікая колькасць людзей, у тым ліку дзеці, лічацца зніклымі без вестак.

## Пабіты рэкорд па колькасці людзей, якія адначасова знаходзяцца на калязямной арбіце



Пасля запуску пілатаванага карабля «Саюз МС-26» устаноўлены новы рэкорд па колькасці людзей, якія адначасова знаходзяцца на калязямной арбіце, паведаміла ТАСС. Адзначаецца, што цяпер у космасе знаходзяцца 19 чалавек, што больш, чым калі-небудзь у гісторыі чалавецтва. Мінулы рэкорд быў устаноўлены летась у маі, калі на калязямной арбіце адначасова знаходзіліся 17 чалавек. Карабель «Саюз МС-26» з міжнародным экіпажам паспяхова стыкаваўся з лабараторным модулем станцыі «Рассвет». Цяпер на борце МКС дванаццаць чалавек. Яшчэ ў космасе знаходзяцца чацвёра астранаўтаў місіі Polaris Dawn Crew Dragon, а таксама трое тайканаўтаў на борце кітайскай арбітальнай станцыі «Цяньгун».

# Паразважаем пра час і пра сябе

**Дзень нараджэння сталіцы і Дзень народнага адзінства адзначаць у эфіры сацыякультурнага тэматычнымі эфірамі. Тэлегледачоў чакаюць паказы мастацкіх кінастужак, выпускі праграм, прымеркаваных да свят.**

Так, 14 верасня на тэлеканале «Беларусь 3» запланаваны паказ праграмы «Культурнае падарожжа» — Мінск натхняльны (БТРК, 2023 г.) у 11.25. А ўвечары ў 18.30 праект «Архітэктура Беларусі» будзе знаёміць гледачоў з Лошыцкай сядзібай (БТРК, 2021 г.). Свайго роду падарункам стане для тэлеаўдыторыі і паказ дакументальнага фільма «Мінск — пра час і пра сябе», які расказвае пра нараджэнне мільённага мінчаніна ў сталіцы (БТРК, 1977 г.). Не прапусціце паказ увечары ў 22.30. А вось завяршальным музычным акордам святочнага дня можна лічыць фільм-канцэрт «Песні Ігара Лучанка» (БТРК, 1972 г.), удзельнікамі якога былі В. Вуячыч, Э. Хіль, В. Кучынскі, Т. Раеўская, «ВІА Песняры».

Што датычыцца планаў тэлеканала «Беларусь 3» на 17 верасня, то тут нам таксама падрыхтавалі шмат цікавага. На працягу дня будуць ісці перадачы, мастацкія і дакументальныя кінастужкі беларускай вытворчасці. Распачне эфір раніцай у 08.15 паказ мастацкага фільма «Чырвонае лісце» («Беларусьфільм», 1958 г.). У 09.50 варта звярнуць увагу на дакументальную стужку «Сяргей Прытыцкі. Тройчы прыгавораны», якая пабачыла свет у 2023 годзе. Абедзве кінаработы звяртаюць да падзей мінулага, з якога варта вынесці ўрокі.

А ў 13.15 запланаваны паказ мастацкага фільма «Дрэвы на асфальце», знятага 40 гадоў таму. Не менш цікавымі і пазнавальнымі будуць дакументальныя выпускі праекта «Жывая спадчына» (БТРК, 2022 г.) і кінаработа «Краіна выратаванага вогнішча» («Беларусьфільм», 2023 г.). У эфіры ў 16.25 і ў 18.05.

Пасля ў 19.00 і ў 21.05 на сацыякультурным пакажуць мастацкія кінастужкі «Вазьму твой боль» («Беларусьфільм», 1980 г.) і «Час вярнуцца» («Беларусьфільм», 2024 г.) адпаведна. Абодва фільмы даследуюць час і чалавечыя паводзіны ў кантэксце няпростых жыццёвых абставін. У завяршанне ў 23.10 у праекце «Кадры жыцця» аматараў беларускага мастацтва чакае сустрэча з народным мастаком Беларусі Іванам Міско.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 226

**З 5 да 15 верасня ў Маскоўскай вобласці (Расія) праходзіць чэмпіянат свету па шашках-64 сярод мужчын і жанчын.**

**У першыя два дні адбыліся хуткая і бліскавічная праграмы. Ігар Міхальчанка — чэмпіён свету ў хуткай праграме, у Андрэя Валюка — «бронза». Марыя Тараніна — сярэбраны прызёр сярод жанчын.**

**У бліскавічнай праграме Андрэй Валюк стаў сярэбраным прызёрам, Ігар Міхальчанка — бронзавым.**

Сённяшнія кампазіцыі складзены вядучым рубрыкі.

№ 135



№ 135
**Белыя простыя:** c1, b2, d2, h2, d6, c7 (6)
**Чорныя простыя:** f2, a3, b4, h4, g5, g7 (6)

№ 136
**Белыя простыя:** b4, d6, h6, a7, e7 (5)
**Чорныя простыя:** f4, c5, g7, f8, дамка g3 (5)

№ 137
**Белыя простыя:** 39, 40, 31, 32, 33, 34, 29, 30, 24, 20 (10)
**Чорныя простыя:** 45, 26, 22, 23, 18, 12, 15, 9, 3 (9)

№ 138
**Белыя простыя:** 49, 43, 31, 32, 27, 28, 22, 11, 12 (9)
**Чорныя простыя:** 42, 38, 40, 26, 30, 23, 19, 13, 14, 9 (10)

Астатнія кампазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак.

№ 139
**Белыя простыя:** f2, f4, g5, c7, дамка h2 (5)
**Чорныя простыя:** b2, d4, c5, h6, e7, дамка b8 (6)

№ 140
**Белыя простыя:** a1, c3, e3, d4, h6, дамка a5 (6)
**Чорныя простыя:** b2, g3, d6, f6, g7, f8, дамка e1 (7)

№ 141
**Белыя простыя шашкі:** d2, f2, h2, g3, b6, d6, c7 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** c3, b4, d4, h4, a5, f5, g7, b8 (9)

Знамянальныя даты: 70 гадоў таму, у верасні 1954 года, у Ленінградзе адбыўся першы чэмпіянат СССР па стаклетачных шашках. Беларусь прадстаўляў майстар Макс Шавель, які падзяліў 6—9 месцы. У наступныя гады Шавель двойчы (1955, 1956) станавіўся сярэбраным прызёрам саюзных чэмпіянатаў і тройчы (1959, 1960, 1976) — бронзавым.

Анонс: першая ліга чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па шашках-100 адбудзецца з 23 да 29 верасня ў РЦАП па шахматах і шашках (г. Мінск, вул. Маркса, 10)

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аутарам і вядучаму за цікавы і змястоўны матэрыял», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

**Праверце свае рашэнні:**

**Выпуск № 225 ад 30.08.2024.**

№ 128 1. b4-c5 [ ПР 1.g7-f8 d2-c1 ] 1...d6:b4 2. f2-e3 d4:f2 3. h2-g3 f2:h4 4. e5-d6 c7:g3 5. a1-b2 c3:a1 6. g7-h8 a1:g7 7. h8:e1 h4:f6 8. e1:a3+

№ 129 1. h6-g7 d8:b6 2. a5:c7 e3:e7 3. g7-f8 b8:d6 4. b4-c5 d4:b6

[ 4...d6:b4 5. f8:g1 d4-c3 6. g1-d4 c3:e5 7. a7-b8 e5-d4 8. b8-f4 d4-c3 9. f4-c1 ]

5. a7:c5 d6:b4 6. f8:g1+

№ 130 1. g7-h8 a7:c5 2. f6-g7 d8:f6 3. g7:g3 h4:f2 4. h8-c3 c5:e7 5. c3:d8 b4-c3 6. d8-g5 a3-b2 7. g5-c1+

№ 131 1. c7-d8 a5:c3 2. d8:h8 d4-e3 3. h8:b2 e3-d2 4. b2-c3 d2:b4 5. a1-b2+

№ 132 1. f2-e3 h4:d4 2. c3:g7 a3:e3 3. a7-b8 f8:h6 4. b8:d2 g5-f4 5. d2:g5 h6:f4 6. g1-f2+

№ 133 1. e7-f8 h6:d2 2. f8:h2 [ 2. f8:a7? c3-b2 3. e1-c3 b2:d4 4. a7:e3 g3-f2= ]

2...b6-a5 [ 2...c3-b2 3. e1-c3 b2:d4 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:a7 ]

3. e1:b4 a5:c3 4. h2-e5 c3-d2 5. e5-g3 h4:f2 6. g1:c1+

№ 134 1. e5-d6 c7:g3 2. e3-f4 g3:e5 3. d4:d8 h6:f4 4. c3-b4 a5:c3 5. d8:f8 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: І. Ананіч (Гродна) В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец).

**«Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013» e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ЭНЕРГІЯ СТВАРЭННЯ, ТВОРЧАСЦЬ І ЛІДАРСТВА

**Што прачытаць у вераснёўскім нумары часопіса «Алеся»?**

### «СЛУЖЫЦЬ КРАІНЕ І БЫЦЬ КАРЫСНАЙ ЛЮДЗЯМ»

— Актыўная грамадзянская пазіцыя — тое, без чаго няма цяпер паўнавартаснага жыцця, у тым ліку і для жанчыны. Быць наперадзе, калі трэба — у тыле і рабіць сваю справу адказна і з любоўю для таго, каб жыццё навокал рабілася ярчэйшым і лепшым, — лічыць начальнік упраўлення па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна сталіцы, старшыня аб'яднанай арганізацыі Беларускага саюза жанчын гэтага ж раёна Наталля Кучынская. З ёй, пераможцай рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023» у намінацыі «Актыўная грамадзянская пазіцыя», пагутарылі аб прафесійным шляху, мэтах і асабістых якасцях жанчыны-лідара.

### ВІВАТ, КАРАЛЕВА!



Народная артыстка Беларусі Наталля Гайда стала сімвалам айчыннай аперэты, яе легендай. На яе і сёння ідзе глядач і дзівіцца зайздроснай творчай форме Наталлі Віктараўны, якая адзначыла сёлета сваё 85-годдзе, 65-годдзе творчасці і 55-годдзе служэння сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. У чым сакрэт яе творчага даўгалецця? Ці лёгка быць Наталляй Гайдай на сцэне і за кулісамі? Гэта «Алеся» і высвятляла ў размове з вядомай артысткай.

### «ГАЛОЎНАЕ — ЗВЯРТАЦЬ УВАГУ НА АСОБУ ВУЧНЯ»

У традыцыйнай рубрыцы «Алесі — 100: жанчыны, гісторыі, вокладкі» распавядаем пра настаўніцу рускай мовы і літаратуры гімназіі № 1 Слуцка Юлію Савановіч. На яе ўроках вучні малююць, здымаюць відэа, робяць плакаты і ставяць невялічкія сцэнкі ў класе. Так Юлія Анатольеўна стараецца прывіць дзецям любоў да слова і чытання. А яшчэ да кожнага вучня знаходзіць індывідуальны падыход:

— Мне самой прыемна і радасна, калі я раблю штосьці цікавае да ўрока, прыдумваю свой, унікальны падыход. Гэтыя ўражанні кампенсуюць усе затраты на падрыхтоўку такога матэрыялу, — прызнаецца Юлія Савановіч.

### «УСЁ БОЛЬШ БЕЛАРУСАЎ ЦІКАВЯЦЦА КІТАЙСКАЙ МОВАЙ»

Намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Лю Сулін лічыць важным развіваць міжлітаратурныя сувязі Беларусі і Кітая. Яна падзялілася з чытачамі «Алесі» сваімі ўражаннямі аб нашай краіне, расказала пра цікавасць беларусаў да кітайскай мовы і да паэзіі Паднябеснай, а таксама пра старажытныя кітайскія традыцыі і свае любімыя стравы.

### ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ МУЖЧЫНАМ ПРА ЖАНЧЫН?

Што трэба ведаць кожнай жанчыне пра сябе, каб быць паспяховай і шчаслівай? Як правільна мужчынам ставіцца да дзівосных жаночых асаблівасцяў? Нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін




галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен Гарбанніджад тлумачыць добра вядомыя жаночыя асаблівасці на падставе навуковых ведаў.

### ПА ВАЛАСАХ ПЛАЧУЦЬ

Прыгожыя, бліскучыя, густыя валасы — прадмет гонару любой жанчыны. Непрыемнасці з імі для многіх — сапраўдная драма. Ці можна вярнуць валасы, калі яны пачалі выпадаць? Як пазбавіцца ад перхаці назаўжды? Да якіх працэдур з валасамі варта звяртацца з асцярогай? Пра гэта і не толькі распавяла доктар-дэрматавенеролаг, трыхолаг Кацярына Ерыгіна.

***У вераснёўскім нумары вы прачытаеце таксама пра асаблівасці турэцкай кухні, карысныя якасці кабачкоў і пра асноўныя тэндэнцыі ў модзе гэтай восені.***

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

### Беларусь 1

**5.45 Меладрама «Абдымаючы неба» (16+).**
7.35 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Арсенал» (12+).
**9.50 Меладрама «Каралева пры выкананні» (16+).**
**11.50** Беларуская суперажанчына.
**12.20** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45** Вакол планеты.
**13.25 Меладрама «Кніжная дзяўчынка» (16+).**
**15.25 Меладрама «Гэта жыццё» (16+).**
**19.30** «Героі» (6+).
**21.00** Галоўны эфір.
**22.35 Меладрама «Права апошняй ночы» (12+).**

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**7.10 Фільм «Усходнія прысмакі-2» (16+).**
**9.10, 0.55** «Метэагід».
**9.35** «Здароўе» (16+).
**10.45** «Жыццё іншых» (12+).
**11.50** «Бачылі відэа?» (6+)
**13.25, 16.20 Фільм «Права на каханне» (12+).**
**18.00** «Кропля ў кроплю» (16+).
**20.00** Наш час.
**21.15 Фільм «Злы жарт» (16+).**
**23.15** «Дыскатэка СССР» (16+).

### СТБ

**6.50 «Дзяўчына без адраса» (12+).**
**8.20** Дак. праект «Тайны космасу» (12+).
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.40** Дак. праект «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**12.10, 13.45, 17.00, 21.15 «Хуткая дапамога-3». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**19.30** «Тыдзень».
**21.00** «Спорт-таймер».
**23.55** Дак. праект «90-я» (16+).

### МІР

**5.00** Мультфільмы (6+).
**6.30 Маст. фільм «Кур'ер» (16+).**
**8.20** «Наша кіно. Неўвядальныя» (16+).
**8.50** «Дыктар робіць» (12+).
**9.30** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны.
**10.10, 15.15, 19.30, 1.00, 4.05 Тэлесерыял «Дзяржаўная граніца» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам» (16+).
**2.35 Маст. фільм «Таямнічая выспа».**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 17.00, 19.00, 20.00, 1.00, 3.00** Навіны.
**5.05, 6.20, 7.15, 8.15, 14.50, 16.50, 18.50, 0.25, 1.05, 2.20** Дзень спорту.
**5.10, 6.25, 7.20, 9.20** Зона Х (12+).
**5.20, 10.15** Тэлефільм (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.30, 12.50, 0.50** Аўтарскі погляд (12+).
**6.35, 8.20, 13.40, 19.35** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.25, 8.45, 15.20** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**9.30, 17.30, 2.30** Тайны следства (12+).
**11.00, 14.10, 0.30** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**11.25** На кантролі Прэзідэнта (12+).
**12.20, 14.05, 17.20, 19.15** Громаў LIVE.
**12.25, 1.30** Дак. фільм (12+).
**13.10, 4.20** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**14.30, 1.10** Твой горад.
**16.00, 18.00** Вакол планеты.
**19.20** Гэта іншае (12+).
**20.05** Вынікі тыдня.
**20.10** Трэнды (12+).
**21.00, 0.05, 2.00, 4.00** Галоўны эфір.
**22.30** Эканамічнае асяроддзе (12+).
**23.35** Зразумелая палітыка (12+).
**3.05** 100 пытанняў даросламу (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00 Фільм «Веру я ў каханне» (16+).**
**10.15** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.35** «Свае».
**11.50** Глядзім мультфільмы.
**12.25 Фільм «Асабістая справа суддзі Івановай» (16+).**
**14.50** «Петрасян-шоу» (16+).
**17.50** «Песні ад усёй душы» (12+).
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Акцэнты».
**22.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**22.55** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.30** «Нядзельны вечар» з Уладзімірам Салаўёвым (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Сэнс жыцця (12+).
**6.50** Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
**7.20** «Дача» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Навука побач» (6+).
**8.55** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**9.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.20** Сямейная справа (6+).
**10.40** «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
**11.15** «Першая перадача» (16+).
**11.50** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.40** «Дачны адказ» (0+).
**13.40** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.30 Драма «Чаклун і Румба» (12+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20** «Ты супер!» (6+)
**23.00** «Зоркі сышліся» (16+).

### Беларусь 3

**7.30, 7.50** Мультфільм (0+).
**8.10** «Веды ў кубе».
**8.45 «Непапраўны лгун». Маст. фільм (6+).**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50, 20.00** «Культурны тыдзень».
**12.30 «На іншым беразе». Маст. фільм (12+).**
**14.25** Патрыятычны форум, прысвечаны Дню народнага адзінства «Если мы едины».
**17.15 «Марскі паляўнічы». Маст. фільм (12+).**
**18.25** «Асобы».
**18.35 «Ты — мне, я — табе». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Дзяржаўная граніца». «Усходні рубеж» (12+).
**23.40** «Апошні дзень» (12+).

### Беларусь 5

**6.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Поўнасталь» (Чарапавец).
**7.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Рубін» (Казань) — ЦСКА (Масква).
**9.50** Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — ЦСКА (Масква).
**12.20** Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — УНІКС (Казань).
**14.15** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Хімкі» — ФК «Арэнбург».
**16.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Масква).
**18.25** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — МХК «Дынама» (Санкт-Пецярбург).
**19.20** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Арсенал» (Дзяржынск). У перапынку — Спорт-цэнтр.
**21.20** Вынікі тыдня.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Васка да Гама» — «Палмейрас». У перапынку — Спорт-цэнтр.
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**0.30** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Грыміа» — «Фламенга». У перапынку — Спорт-цэнтр.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**9.00** «Абмен дамамі» (16+).
**10.20, 10.55, 17.25** Тэлебарометр.
**10.25** Я з вёскі (12+).
**11.25** Смачна есці (12+).
**12.10** «Дзіця з пекла» (16+).
**13.20** «Мама дарагая!» (16+)
**14.25** «Разумны дом» (12+).
**15.25** «Карысная праграма» (16+).
**15.40 Дэтэктыў «Маскоўскія тайны. Графскі парк» (16+).**
**17.30 Баявік «Час патрыётаў» (16+).**
**19.10** «Азбука Уральскіх пельменяў» (16+).
**20.30, 21.15 Серыял «Выпраўленне і пакаранне» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.



### Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**8.00** «Жыццё і лёс».
**8.20** «Сабака Баскервілей». Фільм.
**9.40** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 0.25** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.10** ХХ стагоддзе.
**12.00, 2.20** «Адлюстраванні час». Дак. серыял.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Жорсткі раманс». Маст. фільм.
**15.25** «Агора».
**16.45** «Перасоўнікі. Аляксей Карзухін».
**17.15** Эліса Вірсаладзэ, Вялікі сімфанічны аркестр Дзяржтэлерадыё СССР.
**17.55** «Апавяданні з рускай гісторыі».
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Маналог у 4-х частках».
**21.15** Больш, чым каханне.
**22.00** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.45** «Мегрэ». Тэлесерыял.
**0.40** Ступені цывілізацыі.
**1.55** Раман у камені.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Каханая дзяўчына» (16+).
**7.20, 11.30, 15.40, 17.25, 18.30, 21.30, 23.25, 1.10, 1.55, 2.45, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.40** «Валерый Лявонцьеў. Час імчыцца, нібы вершнік...» (16+)
**9.00** «Быў час» (16+)
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**12.45** «Ад смешнага да вялікага. Раман Карцаў і Віктар Ільчанка» (16+).
**13.30** «Брава, Артыст!» (16+)
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**18.00** Дак. фільм «Ты ў гімнастыцы» (12+).
**18.40** Маст. фільм «Ганна Карэніна» (16+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.25** Маст. фільм «Прыгоды Кошыкава» (16+).
**2.10** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 1.30** Веласпорт. Лімбург. Жанчыны (16+).
**5.00, 8.00** Веласпорт. Лімбург. Мужчыны (16+).
**6.00, 11.30, 20.00** Лёгкая атлетыка (6+).
**9.30** Аўтагонкі на цягавітасць (16+).
**13.30, 15.00, 21.00, 2.30** Снукер (6+).
**19.05** Паўэрліфтынг (6+).
**1.00** Парусны спорт (6+).

### Кінакамедыя

**1.05** «Хто твая бабуля, чувак?» (12+)
**2.55** «Бендэр: пачатак» (16+).
**4.45** «Злыя суседзі» (16+).
**6.20** «Справа ў табе» (16+).
**7.55** «Голая праўда» (18+).
**9.45** «Пракляты чыноўнік» (16+).
**11.30** «Каханне і монстры» (16+).
**13.10** «Крымінальная фішка ад Генры» (16+).
**15.15** «Я худзею» (16+).
**17.20** «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара» (12+).
**19.30** «Як я стаў рускім» (16+).
**21.20** «Без тармазоў» (18+).
**23.10** «Прытварыся маім хлопцам» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.15, 17.05** «Агенцтва В.К.О.» (16+).
**11.00** «Сакрэты здароўя» (16+).
**11.20** «Паглядзім» (16+).
**11.55** «10 самых» (16+).
**12.30** «СуперЖанчына» (16+).
**13.05, 18.55, 2.35** «Сляпая» (16+).
**14.30, 20.20, 3.25** «Варажбітка» (16+).
**16.05** «Тлумачальнік сноў» (16+).
**21.55** «Сельскі дэтэктыў» (16+).
**23.45** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**0.45** «Збеглая нявеста» (16+).
**4.15** «Глядзі сам» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**5.30** Чырвоныя туфелькі і сем гномаў (6+).
**6.55, 7.55, 0.10, 1.10** Чыста англійскія забойствы (16+).
**9.00** Пенелопа (16+).
**11.00** Цуда-дзеткі: шалапутныя чараўнікі (12+).
**12.55** Бюро магічных паслуг (12+).
**15.10** Тайна Мунакра (12+).
**17.15** Страшна прыгожы (18+).
**19.00** 12 гадоў рабства (16+).
**21.35** Дварэцкі (16+).
**1.55** Амелі (16+).
**3.50** Выпадковы раман (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Маша і Мядзведзь» (6+).
**5.50** «Атэль у авечак» (6+).
**6.40** «Смяшарыкі» (6+).
**7.00** «Родныя» (16+).
**8.50** «Пара з будучыні» (16+).
**10.50** «За Палыча!» (16+)
**12.45** «Сэрца і як ім карыстацца» (16+).
**14.40** «Вікінг» (16+).
**17.10** «Глухар у кіно» (16+).
**19.00, 20.55** «Бяжы!» (16+)
**22.45** «На раёне» (16+).
**0.35** «1812: уланская балада» (16+).
**2.15** «1612» (16+).
**4.40** «Кошкін дом» (6+).
**5.10** «Кветачка-Сямікветачка» (6+).

### ЯСНАе

**4.55** Серыял «Крот» (16+).
**6.40** Дак. фільм «Савецкія мафіі. Пярэваратні ў пагонах» (16+).
**7.25** «На самай справе».
**7.40** Серыял «Афіцэры» (12+).
**9.25** Серыял «Неадкладнае рэагаванне» (16+).
**11.10** Серыял «Брат за брата» (12+).
**12.45** Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
**15.20** Серыял «Марскія д'яблы-3» (12+).
**17.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Мінск» — «Гомель».
**19.00** Дак. серыял «Хронас».
**19.15** Серыял «Сляпы» (16+).
**21.00** «Ясна аб футболе».
**21.30** «Ясна аб хакеі».
**22.05** Серыял «Снайпер: Апошні стрэл» (12+).
**23.35** Маст. фільм «Шчыт айчыны» (16+).
**1.00** Маст. фільм «Сыны сыходзяць у бой» (12+).
**2.35** Серыял «Маёр Ветраў» (12+).

### Звязда

**6.00, 7.00** «Подзвіг Адэсы». Маст. фільм (12+).
**8.15, 9.05, 10.00, 10.55** «Без права на выбар» (16+).
**11.50, 12.40, 13.25, 14.15** «Скачок Багамола» (12+).
**15.05, 15.55** «Пазыўны «Зграя». Паляванне на мільярд» (16+).
**16.45** «Гарады-героі. Ленінград». Дак. фільм (12+).
**17.50, 18.40** «Чорныя ваўкі» (16+).
**19.30, 23.00** «168 гадзін».
**20.00, 20.45** «Полымя пад попелам» (12+).
**21.30** «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
**22.45, 3.45** «Полацкі ўмацаваны раён».
**23.30** «Крэпасць на Дзвіне». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Георгій Жукаў. Капкан для камкара». Дак. фільм (12+).
**0.45** «Беларускі вердыкт. Сябры і ворагі Фрыца Шменкеля». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Віцебшчына. Партызанскі край» 1-я серыя.
**2.45** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Ад Рузвельта — Сталіну. Беларусы ў справе на мільярд». Дак. фільм (12+).

### Viasat Explore

**0.25, 1.15, 2.00, 2.45, 17.45, 18.40** Канадскія лесавозы.
**3.30, 8.05, 9.05** Паляўнічыя на падземныя скарбы.
**4.25, 5.10** Аўстралійскія паляўнічыя на лобстараў.
**6.05** Пакажы, дзе ты жывеш.
**6.30, 7.15** У пагоні за монстрамі.
**10.05, 11.05** Вада і жыццё.
**12.10, 13.00, 21.20, 22.15** Дарогі без правілаў.
**13.55** Машыны з таго свету.
**14.50, 19.30** Іржавыя тачкі Вегаса.
**15.40, 16.45** Авіятары.
**20.25** Драндулеты на продаж: аднаўляем класіку.
**23.10** Жалезная гара.
**23.40** Адчайныя дальнабойшчыкі.

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.20, 0.30** Зона Х (16+).
**9.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10, 22.30 Серыял «След» (16+).**
**12.25, 0.50** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.30 Меладрама «Вера больш не верыць» (12+).**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.45** Беларуская часінка.
**19.15 Меладрама «Святло ў акне» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Трэнды (12+).

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20, 13.15, 22.45 Фільм «На скрыжаванні радасці і гора» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Аб'ектыўНа» (16+).
**20.00, 0.50** Час.
**21.20** «Усё зразумела» з Марынай Караман (16+).
**21.30 Фільм «Цана маўчання» (12+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
**10.40** Дак. праект «Тайны космасу» (12+).
**13.50, 0.50 «Паліцэйскае братэрства». Серыял (16+).**
**16.50 «Хуткая дапамога-3». Серыял (16+).**
**20.15, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Мінщына».
**20.45 «Паўночная зорка». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00, 2.05 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15, 10.10 Тэлесерыял «Станіца» (16+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.45** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.30 Маст. фільм «Кітайскі сервіз» (16+).**
**0.30** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**1.05** Першы Еўразійскі канал (12+).

## Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 19.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны.
**5.15, 6.20, 8.50, 14.50, 16.50, 18.50, 22.00, 0.15, 1.10, 2.10, 3.10** Дзень спорту.
**5.20, 6.25** Навіны эканомікі (12+).
**5.25, 6.30, 7.50, 9.50, 11.50** Зона Х (16+).
**5.30, 6.35, 11.45, 12.50, 16.40, 0.50, 2.45** Аўтарскі погляд (12+).
**5.35, 6.40, 7.45, 9.55** Прэс-агляд.
**5.40, 6.45, 14.35, 1.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**7.20, 8.20, 9.20** Ранішні эфір.
**8.55** Метадата.
**10.05, 14.05, 18.30, 23.40, 1.15** Гэта іншае (12+).
**10.30** Тайны следства (12+).
**11.05, 12.25** Дак. фільм (12+).
**13.15, 19.40, 22.15, 0.20, 2.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**13.35, 15.30, 3.30** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**16.10** Спорт-кадр.
**17.30** Дак. фільм (12+).
**18.15, 20.45, 0.35, 2.30, 3.15** Зона Х. Вынікі (16+).
**20.05, 4.10** Трэнды (12+).
**21.00** Панарама.
**22.10** Прагноз надвор'я.
**22.35** Эканамічнае асяроддзе (12+).
**0.05** Навіны апоўначы.

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**10.50, 18.40** Гумарыстычная праграма (16+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Беларусь. Навіны.
**11.40** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.50** «Кропкі над «і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**16.10 Тэлесерыял «Васіліса» (12+).**
**17.40 Тэлесерыял «Сабачая работа» (16+).**
**18.55** «Малахаў» (16+).
**20.20** «Так! Але...» Ток-шоу.
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Дама з сабачкам» (16+).**
**23.45** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.20, 13.20, 22.50, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі вырatавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.25** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.25, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.45 Серыял «Рускія» (16+).**
**22.55, 0.00 Дэтэктыў «Неўскі. Расплата за справядлівасць» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.55, 20.30, 22.50** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Справа гастранома № 1». Маст. фільм (16+).**
**10.00** «Легенды эстрады».
**10.40, 17.05 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+).**
**11.50** «Сэнс жыцця».
**12.15** «Архітэктура Беларусі».
**13.15, 18.15** «Апошні дзень».
**13.55, 18.55 «Ідэальны муж». Маст. фільм (12+).**
**15.25** «Разам пра каханне».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Кадры жыцця».

## Беларусь 5

**6.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Дынама» (Масква) — «Ахмат» (Грозны).
**8.55** Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
**9.45** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Авангард» (Омск).
**11.40** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Дынама» (Махачкала) — «Спартак» (Масква).
**13.35** Дзюдо. Сусветны тур.
**15.10** Футбол без межаў.
**16.10** Футбол. Кубак Расіі. «Акрон» (Тальяці) — «Факел» (Варонеж).
**18.15** Спорт-цэнтр.
**18.25** Слэм-данк.
**18.55** Футбол. Кубак Расіі. ЦСКА (Масква) — ФК «Краснадар». У перапынку — Спорт-цэнтр.
**20.55** Між іншым.
**21.10** Футбол. Кубак Расіі. «Дынама» (Махачкала) — «Дынама» (Масква). У перапынку — Спорт-цэнтр.
**23.10** Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. «Атлетыка Гаяніенсэ» — «Віторыя Салвадор».

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 17.55** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**10.35, 18.25 Дэтэктыў «Філін-2» (16+).**
**12.25, 22.15 Серыял «Спаская-2» (16+).**
**14.30** «Дзіця з пекла» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Разумны дом» (12+).
**20.10 Серыял «Выпраўленне і пакаранне» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Камедыя «Радкам» (16+).**
**0.20 Дэтэктыў «Шуйка» (16+).**



## 8 канал

**7.00, 21.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.25** «Дзеці аб ежы».
**7.45, 15.35** Камедыя «Медыум» (16+).
**9.30, 12.00** Серыял «Код доступу» (16+).
**11.15** «Дак. экран».
**13.45, 17.25, 19.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**13.50** Камедыя «Забойства на яхце» (16+).
**15.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**17.30** Драма «Сямейная хроніка» (16+).
**19.10** «Вячэрні серыял».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Любімае кіно».
**23.25** «Рэтра ТБ».
**0.50** «Начны серыял».

## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05, 18.45** Ступені цывілізацыі.
**8.00** «Жыццё і лёс».
**8.20, 21.35** «Час для разважанняў». Маст. фільм.
**9.30** Раман у камені.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.20** «Сувораў». Маст. фільм.
**12.10** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**13.00** «Маналог у 4-х частках».
**13.30** Улада факта.
**14.15** «Гісторыя аднаго кахання». Маст. фільм.
**15.45** «Энігма. Уладзіслаў Чарнушэнка».
**16.45** Лісты з правінцыі.
**17.15** «Царская ложа».
**18.10** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**19.45, 1.35** Шукальнікі.
**20.35** Лінія жыцця.
**22.45** «2 Вернік 2».
**23.55** «На Месяцы». Маст. фільм.
**2.25** Антон Барахоўскі, Акадэмічны сімфанічны аркестр Навасібірскай філармоніі.

## Настальгія

**6.00** «Андрэй Міронаў. Пястун лёсу» (16+).
**6.45** Маст. фільм «Гэтае выдатнае жыццё» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.30, 12.50, 14.45, 15.40, 17.30, 19.10, 20.45, 21.40, 23.30, 0.45, 1.35, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Адзін плюс адзін. Дуэты на эстрадзе» (16+).
**13.05** Маст. фільм «Тыя, што спяваюць пад дажджом» (12+).
**18.00** «Да і пасля...» (16+)
**19.30** Маст. фільм «Мантана» (16+).
**0.00** «Быў час» (16+).
**1.00** «Уладзімір Басаў. Ільвінае сэрца» (16+).
**1.50** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**2.30** Рытмічная гімнастыка (12+).

## EuroSport 1

**4.00, 12.30** Маўнцінбайк (16+).
**4.30, 8.00, 11.30, 1.00** Веласпорт. Тур Люксембурга. Мужчыны (16+).
**6.00, 9.35, 13.00, 18.00, 2.30** Снукер (6+).
**14.00, 16.00, 19.00, 20.00, 22.00** Тэніс.
**0.00** Трэйл (0+).

## Кінакамедыя

**0.50** «Шэф Адам Джонс» (18+).
**2.55** «Бясстрашныя летуны» (18+).
**4.35** «Хто твая бабуля, чувак?» (12+)
**6.15** «Я худзею» (16+).
**8.10** «Выкідала» (18+).
**9.50** «Голая праўда» (18+).
**11.45** «Непрыстойныя госці» (18+).
**13.20** «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (16+).
**15.40** «Скарбы джунгляў» (18+).
**17.20** «Астэрыкс і Абелікс: Паднябесная» (16+).
**19.30** «Прыгажунчык-2» (18+).
**21.50** «Свінгеры» (18+).
**23.40** «Хэпі-Энд» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.50** «Узбочына» (12+).
**11.30** «Паглядзім» (12+).
**12.00, 18.10** «Каралёк — птушка пеўчая» (16+).
**13.45, 20.00, 1.55** «Сляпая» (16+).
**15.10, 21.00, 3.10** «Ваража́бітка» (16+).
**16.45** «Старац» (16+).
**22.05** «Дом ля возера» (16+).
**23.50** «Сківіцы» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.30** Маё цудоўнае няшчасце (18+).
**7.00, 8.00, 23.05, 0.05** Чыста англійскія забойствы (18+).
**9.00** Мой любімы вораг (16+).
**11.05** Чырвоныя туфелькі і сем гномаў (6+).
**12.55** Эспен у каралеўстве троляў (6+).
**15.00** Эспен у пошуках Залатога замка (6+).
**17.05** Цуда-дзеткі: шалапутныя чараўнікі (12+).
**19.00** Рэальныя ўпыры (16+).
**20.45** Візантыя (16+).
**1.05** Акадэмія вампіраў (16+).
**2.40** Ноч у краме жахаў (16+).
**3.50** Пенелопа (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Маша і Мядзведзь» (6+).
**5.35** «Атэль у авечак» (6+).
**5.50** «Смяшарыкі» (6+).
**6.10** «Тры каты» (6+).
**6.30** «Несмяротныя» (16+).
**8.25** «Быць» (16+).
**10.40** «Глухар у кіно» (16+).
**12.25, 14.20** «Бяжы!» (16+)
**16.15** «Дзесяць негрыцянят» (16+).
**19.00** «12» (16+).
**22.10** «Непрабачаны» (16+).
**0.20** «Тэлекінез» (18+).
**2.00** «Вася не ў сабе» (16+).
**3.35** «30 спатканняў» (16+).
**5.00** «Гадкае качаня» (6+).
**5.20** «Воўк і цяля» (6+).

## ЯСНАе

**4.45** Серыял «Майстар і Маргарыта» (12+).
**6.25** Серыял «Мужчынская работа» (12+).
**8.00** «Ясна аб міні-футболе».
**8.30** Серыял «Афіцэры-2» (12+).
**10.20** Серыял «Крэмень. Вызваленне» (16+).
**12.05** Серыял «Брат за брата-2» (16+).
**13.45** Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).
**16.20** Серыял «Марскія д'яблы-3» (12+).
**18.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Мінск».
**19.55** Серыял «Сляпы-2» (12+).
**21.30** «Час высокіх тэхналогій».
**21.55** Серыял «Аперацыя «Гаргона» (16+).
**23.35** Маст. фільм «Час патрыётаў» (16+).
**1.15** Маст. фільм «Асада Робін Гуда» (18+).
**3.15** Маст. фільм «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Партызанская граніца». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Бяром усё на сябе». Маст. фільм (12+).
**8.40, 19.50, 21.05** «Вайна. На заходнім напрамку». Маст. фільм (16+).
**9.55, 10.45** «Чорныя ваўкі» (16+).
**11.35, 12.20** «Полымя пад попелам» (12+).
**13.05** «Дзяржаўная граніца. Ілжывая мэта». Маст. фільм (12+).
**14.55, 15.40** «Чырвоная капэла» (12+).
**16.25, 23.50** «Віцебшчына. Партызанскі край».
**17.00, 22.45, 3.50** «Полацкі ўмацаваны раён».
**17.15, 18.25** «Слухаць у адсеках». Маст. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**22.15, 3.20** «Палескі кацёл. Войска асуджаных». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Радзіма» або смерць. З Надзеяй — за Францыю». Дак. фільм (12+).
**0.25** «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
**0.55** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**1.25** «Варшаўская граніца. Беларусы ў Войску Польскім». Дак. фільм (12+).
**1.55** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**2.25** «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## ПАЙШОЎ ПА ВОЎНУ, ВЯРНУЎСЯ ПАСТРЫЖАНЫМ

Сказаць, што студэнты-філфакаўцы педінстытута Міхась і Пятрок не ведалі сэнсу гэтай народнай прымаўкі, будзе няпраўдай. Ведалі, ды яшчэ як! На «выдатна» здалі іспыт па прадмеце «Фальклор», а потым — ну здараецца ж! — «схадзілі па воўну»...

Пачалося ўсё з таго, што Міхасю стрэліла ў голаў даследаваць... рэстараны: паглядзець на «залатую моладзь», якая марнатравіць там свае дні і потым даць ёй добры адлуп на старонках газеты.

Дзеля гэтага аднойчы ўвечары Пятрок пад гальштукам «селядзец» і Міхась пад так званай бабачкай (абодва ў новых касцюмах) занялі столік, узялі меню і сталі назіраць за прысутнымі. Прыкмячаць, што адзенне ў многіх самае маднецкае: яркія сарочкі, штаны «дудачкі» (1961 год) і «кляшы», стрыжкі пад Катоўскага, патлы-грывы афрыканскіх ільвоў... Нехта з гэтых маладых танцаваў бугі-вугі (у зале граў невялічкі аркестр), нехта ў куце падалей зацягваў песню, двое схапіліся загрудкі...

— Выбар зрабілі? — спытала ў «даследчыкаў» афіцыянтка.

— Мне, калі ласка, айнтопф, — на вельмі добрай... нямецкай мове адчаканіў Пятро.

— Шнэльклопс, — папрасіў для сябе Пятро.

— Адну хвілінку, — зноў жа па-нямецку папрасіла афіцыянтка, схадзіла на кухню і, вярнуўшыся, стала выбачацца: іх кухар не ведае такіх страў... — Закажаце нешта іншае?

«Немцы» ў адказ закруцілі насамі, пакрыўдзіліся і замовілі хіба каву.

Так было ў першы вечар і ў гэтым рэстаране, у наступныя і ў іншых — кухары не змаглі прыгатаваць гасцям баграч-гуляш з чыпеткамі, паштэль-дэ-ната, курыцу гаран масала... Таму хлопцы (іншаземцы!) пілі каву, практыкаваліся ў веданні нямецкай мовы і, вядома ж, прыцягвалі ўвагу прысутных — аж да таго, што неяк да іх падселі дзве п'янаватыя «лялькі», убачылі на стале каву ды пустыя фужэры і дружна скрывіліся:

— Не п'яце? Слабакі!

«Хто?! Мы?!» — абурыліся б палешукі, калі б не касілі пад немцаў. А косячы, Пятро дастаў з-за пазухі пляскатую пляшачку «каньяку» (столінскай, самаробнай, настоенай на мяце, чабарку ды іншых пахучых зёлках!), і, спаслаўшыся на тое, што самі павячэралі, наліў дзяўчатам. Смялейшая з іх прыгубіла-пакаштавала, паказала вялікі палец (во, маўляў!) і... паклікала афіцыянтку.

— Венскі шніцаль, пірог са смажанай гусяцінай, — стала пералічваць ёй, — макавы рулет... Усё ў двух экзэмплярах (сяброўка згодна ківала). Кавалеры частуюць.

Пачуўшы гэта, Пятрок з Міхасём хацелі залезці пад стол, бо ім разлічвацца... Але ж своечасова сцямілі: сказалі дзяўчатам, што ідуць па букеты і... збеглі.

У рэстаран пасля гэтага не хадзілі месяцы са два.

...Калі зноў з'явіліся, «лялек» там не было.

Затое да століка падышла ўжо знаёмая афіцыянтка, яна ж — на здзіўленне гасцям — прыняла заказ на айнтопф і шнэльклопс (назвы гэтых хлопцы знайшлі ў глянцавым часопісе, які невядома хто і калі пакінуў у студэнцкім інтэрнаце) і досыць хутка прынесла стравы. «Немцы» пакаштавалі і, калі б не думка, што трэба плаціць, з'елі б за малінку, а так...

Давялося ўрэшце прызнацца, што столькі грошай у іх з сабою няма, што яны змогуць разлічыцца заўтра.

Толькі ж хто ў гэта паверыў?!

Афіцыянтка паклікала міліцыю і адміністратара. У хлопцаў папрасілі дакументы і тут жа агучылі ўмову: «Альбо сёння плаціце, альбо заўтра пра ўсё будзе ведаць рэктар, і па галоўках вас не пагладзіць — вытурыць з інстытута як піць даць».

Пятрок у выніку застаўся ў рэстаране, Міхась у пошуках грошай (напрамілы бог! Хто колькі дасць!) аббегаў два паверхі інтэрната.

Вось так спраўдзілася прымаўка: пайшлі па воўну (то-бок па артыкул у газету, па годны ганарар), а вярнуліся...

Стрыжка пад Катоўскага і сёння, здаецца, у модзе?

**Уладзімір Пернікаў,**
*г. Гомель.*

## ЖЫЦЦЁ ДАРАЖЭЙШАЕ ЗА ГРОШЫ

Некалі многія нашы хлопцы, многія дзяўчаты рваліся ў белы свет, як у тую капеечку, ехалі «за туманам» — не слухаліся бацькоў, рабілі па-свойму.

А таму адна з матуль нават слёзы не марнавала: аддала свайму сыну апошнія грошы, сказала: «Едзь. І калі ўбачыш там хоць аднаго яўрэя, то заставайся, а калі не — дай мне слова, сынок, што тут жа вернешся».

Мудрая была жанчына, ведала, што яўрэі абы дзе не сяліліся, абы дзе не жылі. На маёй роднай Піншчыне (цудоўны край!) іх многа было.

Але ж вось пачалася вайна, у Пінску праз тыдзень-другі з'явіліся немцы. Бацька Міхася Фрыдмана выршыў уцякаць: згаварыўся са знаёмым пінчуком, той за добрыя грошы падагнаў каня, прыняў на воз мяшкі з неабходным дабром і вывез сям'ю ў ровенскі лес.

Як доўга яны ехалі, сказаць не бяруся, але ж спыніліся ў доме лесніка-украінца. Браліся там за любую работу, вялі немалую гаспадарку, і ежай, і вопраткай, і лекамі — чым маглі, дапамагалі партызанам... Праўда, гісторыя мая зусім не пра гэта.

У лесніка таго была дачка — прыгажуня Маруся, у Фрыдманаў — сын, Міхась (пазней — татаў найлепшы сябар). Маладыя людзі пакахалі адно аднаго, там жа (вайна вайной...) справілі ціхае вяселле.

...Пасля вызвалення час быў вяртацца дадому, у Пінск. Там, дзякуй богу, ацалелі сцены іх дома, пакрысе стала наладжвацца жыццё. У Міхася і Марусі была работа, яны будавалі дом, выхоўвалі двух сыноў. Але ж вось наступілі 70-я, у яўрэяў з'явілася магчымасць з'ехаць на сваю гістарычную радзіму, і многія сталі збірацца.

Планавалі ад'езд і родныя Міхася — яго бацькі, браты з жонкамі, з дзецьмі, не супраць быў старэйшы сын, а вось малодшы і Маруся (яе немаладыя бацькі па-ранейшаму жылі на Ровеншчыне ў лесе) нават слухаць не захацелі!

...Нялёгка, відаць, даваліся падобныя рашэнні, і, тым не менш, Міхась аформіў усе дакументы на выезд у Ізраіль, звольніўся з работы, адправіў кантэйнер з неабходнымі рэчамі, наплакаўся — развітаўся з жонкай, выбраўся ў далёкую дарогу. Спачатку — аўтобусам — з Пінска ў Брэст, з Брэста — планаваў — цягніком да Масквы, адтуль — ужо самалётам...

І частку гэтай дарогі чалавек агараў: даехаў да Брэста. Сядзіць там, чакае цягніка ды ўспамінае ўсё перажытае: як уцякалі ад фашысцкай навалы, як хаваліся-ратаваліся ў ровенскім лесе, як першы раз убачыў сваю Марусю, як ладкаваў з ёй мірнае жыццё, гадаваў дзяцей і як цяпер во... кінуў. Дзеля чаго? На каго? І — урэшце — каго? Тую, без якой, напэўна, не было б і — дакладна — не будзе далейшага жыцця?

Вось гэта, апошняе, Міхась зразумеў толькі ў Брэсце, седзячы на чамадане.

А далей...

Устаў, рушыў да касы, каб здаць білет.

— Ой, ён жа дарагі! — замітусілася касірка. — Я, мусіць, не змагу вас хутка разлічыць!

— І не трэба, — супакоіў жанчыну Міхась. — Жыццё даражэйшае за грошы.

Выйшаў на вуліцу, злавіў таксі і, бясконца шчаслівы, паехаў дамоў, да сваёй Марусі. Во ўжо дзе слёз было!.. Што, праўда, ад радасці.

...У Пінску гэту прыгожую пару ведалі вельмі многія.

Хацелася б сказаць, што яны, дзядзька Міша і цётка Маруся, жылі як у казцы: доўга, шчасліва і памерлі ў адзін дзень... Але апошняе будзе няпраўдай: сужэнцы пражылі амаль па 90 гадоў, з іх каля 70 разам.

**Ніна Горгуль,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж:*** калі ў дваіх чалавек па яблыку і яны абмяняюцца імі, то ў іх па-ранейшаму будзе па яблыку. Калі ў дваіх па ідэі і яны абмяняюцца, то ў іх стане па дзве ідэі... А вось калі ў іх па «вясёлай, праўдзівай гісторыі» і яны падзеляцца імі з чытачамі «Звязды», то...

Паспрабуйце (калі не спрабавалі)! Пабачым, што атрымаецца?

Неасабісты суб'ектыў



# СПРАВА ВЫПАДКУ

### Чым можа скончыцца перарваны адпачынак

СУСТРАКАЮ нядаўна прыяцельку, з якой не бачылася з вясны, — і не пазнаю. Замест звычайнага строгага касцюма і туфляў на абцасе — працуе галоўным бухгалтарам у буйной кампаніі, трэба адпавядаць — зусім легкадумная сукенка ў кветкі, на нагах — балеткі колеру мальвы. Валасы сабраныя не ў вечную гульку, а ў нейкую падобную на старажытнагрэчаскую прычоску. Карацей, і яна, і не яна. «Або закахалася, або з глузду з'ехала са сваёй работай», — пранеслася ў галаве, прычым другі варыянт падаваўся больш рэальным, бо прыяцельцы ўжо крыху больш за пяцьдзясят, яна адзінокая самадастатковая дама, якая жыве на працы. Але тут я не ўгадала — яе, як высветлілася ў кавярні за келіхам белага віна, накрыла гісторыя, амаль як у «Службовым рамане», прынамсі па выніках. Сюжэт жа быў нашмат мудрэйшы, чым у кіно, такі толькі жыццё можа падкінуць.

КАРАЦЕЙ, надумалася Надзея гэтым летам нарэшце выбрацца ў адпачынак на мора. Узяла водпуск на тры тыдні, чаго ніколі сабе не дазваляла, купіла дарагую пуцёўку на шаснаццаць дзён, сямнаццаць начэй у адну паўднёвую краіну. Сабрала чамаданы і паляцела. Кватэру ні на кога не пакідала — пры яе раскладзе жыцця ні хатніх жывёл, ні кветак не гадуе, таму даглядаць у яе адсутнасць няма каго... Усё пачыналася вельмі здорава: мора, сонца, доўгачаканы спакой. Але гэты рэлакс прадоўжыўся ўсяго шэсць дзён. На сёмы па месенджары (яна, наіўная, адключыла сім-карту і думала, што будзе недасягальная) пазваніў шэф і слёзна прасіў тэрмінова вярнуцца: маладыя дзяўчаты ў бухгалтэрыі нешта такое напарталілі з квартальнымі і паўгадавой справаздачамі, што магло дайсці і да крымінальнай справы. Усе выдаткі, канешне, шэф браў на сябе, сам знайшоў і заказаў ёй новы білет на самалёт, паабяцаў у якасці кампенсацыі выпісаць прэмію з чатырма нулямі...

РАНІЦАЙ роўна праз тыдзень яна зноў з чамаданамі, адзін з якіх нават не паспела распакаваць, стаяла перад дзвярыма сваёй кватэры. Злосная, сонная, думала толькі пра тое, як зараз вып'е кавы, пасля, калі атрымаецца, падрэмле якую гадзінку і памчыць на «любімую» работу. Адамкнула дзверы, адразу прайшла на кухню — і ледзь не самлела. На яе кухні за яе сталом зусім па-гаспадарску сядзеў незнаёмы мужчына і піў каву з яе любімага кубка! «Што вы тут робіце?!» — амаль хорам ускліннулі абое пасля непрацяглай нямой сцэны. Пасля ўсчаўся гэткі лёгкі скандал, падчас якога яна парывалася выклікаць міліцыю, а ён даводзіў нешта ну зусім незразумелае: «Чаму вы так рана? Я ж з'язджаю толькі праз два дні...» Мужчына быў збянтэжаны і зусім не бандыцкага выгляду, таму, крыху супакоіўшыся, яна вырашыла ўсё ж выслухаць, як ён апынуўся ў яе кватэры.

Аказалася, ён камандзіровачны, прыехаў са Смаленска на дзесяць дзён вырашыць працоўныя пытанні сваёй фірмы. У атэль засяляцца не стаў, вырашыў на гэтыя дні зняць кватэру з усёй абстаноўкай. У інтэрнэце размясціў аб'яву, на яе вельмі хутка адгукнуўся малады чалавек, які прапанаваў апартаменты з усім «начыннем» у добрым раёне па зусім невялікай цане. Умовы былі: сто працэнтаў перадаплата і з'ехаць да пэўнага числа. Што прыезджага задавальняла — ён і не збіраўся заставацца даўжэй. Ключы атрымаў праз дзве гадзіны, паглядзеў кватэру — усё спадабалася, аддаў грошы, ударылі па руках — і «гаспадар» знік у невядомым напрамку. Ён жа спакойна рабіў свае справы, жыў ва ўтульнай кватэры, а Надзею прыняў за чарговую кватарантку, якой здалі апартаменты, не дачакаўшыся, пакуль з'едзе ён...

